Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 05 (2855) Год LVI | Беласток, 30 студзеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

МАЛАДАЯ ГАЙНАЎКА (ч. 1)

Тамаш Анікіюк - народжаны ў 1978 годзе ў Гайнаўцы, фатограф, дакументаліст, аўтар фільмаў „Jest takie miejsce" (2008), „Szukając Boga" (2009), „Powroty — Rockowisko 2009", „Klimaty — Rockowisko 2010", „Przewłoka wiecznie żywa" (2010); лаўрэат фотаконкурсаў „Podlasie w obiektywie" і „Portrety Hajnowian"; намінаваны да ўзнагароды „Гайнавянін года" ў 2009 і 2010 гг.

„РАЗ У МЕСЯЦ НЕ СПЛЮ ЎСЮ НОЧ"

— з *Тамашом Анікіюком* *гутарыць* *Ілона Карпюк*

— Ці Ты яшчэ фатограф, ці ўжо чалавек фільма?

— Хутчэй за ўсё асацыюю сябе з фотаапаратам чым камерай, хаця і адным, і другім займаюся як аматар.

— За Твае здымкі Цябе неаднойчы ўзнагароджвалі. Чаму ўсё ж такі вырашыў узяць камеру?

— Сам не ведаю як гэта сталася. Трапіў я на адно з мерапрыемстваў, ладжаных Усеагульным універсітэтам у Тэрэміках. Меў пры сабе фотаапарат і камеру, але паспрабаваў тады ўпершыню нешта сфільмаваць.

— Эфектам стаў фільм „Jest takie miejsce"?

— Так. Тады фотаапарата я нават не вымаў. Праўда, здараліся такія моманты, што трэба было і фільмаваць, і рабіць здымкі, але я зразумеў, што тады ні адно, ні другое не атрымліваецца так як павінна. Таму „фоцік" ляжыць і чакае свайго часу.

— Усё ж такі Ты выбраў фільм.

— Так, хаця часам шпацырую па пушчы з фотаапаратам.

— Пушчу надта кахаеш. Адной з праяваў гэтай любові з'яўляецца фільм „Przewłoka wiecznie żywa", які асабліва ў Гайнаўцы прыцягнуў да Цябе ўвагу гледачоў.

— Можна сказаць, што я выхаваўся ў Перавалоцы. Мой бацька там працаваў, пасля шлюбу пераехала мама. Жылі ў працоўным інтэрнаце, які зараз ужо амаль цалкам зруйнаваны. У фільме хацеў я вярнуць памяць пра гэтае месца, якому я быў надта адданы. Жыў я там шэсць гадоў, ведаў кожнае дрэва. Пасля і кожныя канікулы там праводзіў, вяртаўся з Гайнаўкі, калі толькі была магчымасць. Нават, калі ўжо інтэрнат папаў у руіну, ездзілі мы там на 3-4 дні, каб проста пабыць.

— У сваіх фільмах распавядаеш у асноўным пра Гайнаўшчыну.

— Бо ёсць пра што распавядаць. У галоўным пра тое, што гіне, адыходзіць. Старыя хаты, якія перабудоўваюць, або зносяць. Таксама тая Перавалока — чакае толькі кагосьці, хто яе разбярэ канчаткова. Адыходзіць нават краявід.

— Грабарка так хутка не знікне, але і пра яе паўстаў фільм.

— Гэта вельмі асабісты фільм. Хіба як усе (*смех*). Люблю туды ездзіць. Не толькі з-за здымкаў ці фільмаў. Там відаць Бога ў людзях, на вуліцы гэтага не пабачыш. Фільм пра Грабарку ўзнік вельмі спантанна. Матэрыял чакаў бадай два гады, калі да яго зноўку я вярнуўся. Перабраў, змантаваў і ёсць. Патрэбны момант.

— Нясмела пачынаеш высылаць свае фільмы на конкурсы. Калі прыйдуць поспехі?

— Часам нешта высылаю, хаця, напрыклад, у мінулым годзе не паспеў з „Перавалокай". Трэба было пакараціць, а я не ўмеў. Усё здавалася мне важнае. Затое буду рабіць другую частку. Пры першым фільме гэта я мусіў шукаць людзей. Зараз самі да мяне звяртаюцца. Атрымаў здымкі з Варшавы, прыязджаюць далёкія сваякі, аказалася, што Віктар Кабац пабываў там на пленэрах. На пачатку было вельмі цяжка. Расказваць па-за камерай хацелі ўсё, але перад камерай ужо неахвотна. Тлумачыў, што гэта будзе памятка для ўсіх, што захаваем памяць пра гэтае месца. Не заўсёды хапала такіх аргументаў. Дзеля першай часткі трэба было „выездзіць" увагу і ахвоту суразмоўцаў.

— „Гайнаўскія фільмавыя хронікі" — гэта адна з Тваіх пакуль не здзейсненых задумак. Хочаш стаць мясцовым хранікёрам?

— Задумаў нешта накшталт „Польскіх фільмавых хронік", але ў мінулым годзе не атрымаў фінансавання. Можа ў гэтым удасца. Дарэчы, на конкурс „Żubr budzi Podlasie" паслаў ажно чатыры праекты. Пабачым, ці будзе паспяховы фінал. Пакуль адзін з маіх праектаў атрымаў прызнанне Маршалкоўскай управы і буду рэалізаваць ужо другі фільм з цыкла „Забыты свет Падляшша". Першы — гэта пра Перавалоку, другі будзе пра курганы. Апрача гэтага марыцца мне стварыць мультымедыйны атлас шляхоў Белавежскай пушчы, у фільме і фатаграфіі. Планую працягваць таксама цыкл „Забыты свет Падляшша" ды яшчэ стварыць дакумент пра цудоўныя месцы Гайнаўшчыны.

— Маеш ужо каталог гэтых цудаў?

— Напэўна пачну з Крыначкі. А іншыя трэба знайсці. Прыйдзецца шукаць па вёсках, сярод людзей. Маю на ўвазе не толькі сакральныя месцы, але таксама архітэктуру ці краявід.

Фота Тамаша Анікіюка

— Што праз 50 гадоў пабачым у Тваіх хроніках?

— Усё, ад звычайнай, штодзённай працы ў краме, праз жыццё навакольных вёсак, па культурныя падзеі горада. Неўзабаве буду збірацца да рэалізацыі фільма з нагоды 60-годдзя атрымання Гайнаўкай гарадскога права. Будзе гэта працяг фільма Тамары Саланевіч з 1966 г. „Miasto na skraju puszczy".

— Надалей незалежна ці ўжо ў паразуменні з уладамі?

— Пры дапамозе ўлад горада. Можна пачынаць незалежна, але пасля аказваецца, што без дапамогі, без грошай нічога большага не здзейсніцца.

— Ці ёсць у Гайнаўцы месца, дзе можна прамаваць альтэрнатыўную культуру?

— Думаю, што Беларускі музей становіцца такім месцам. Адбываюцца ў ім цікавыя канцэрты, выстаўкі, конкурсы, кінапаказы, напрыклад „Pogoń za filmem". Яны спрычыняюцца да таго, што больш людзей пачынае фільмаваць, рабіць здымкі, часцей у шуфляду, але калісьці можа з гэтага атрымацца важная справа.

— Ці Цябе распазнаюць як аніматара культуры ў Гайнаўцы?

— Не ведаю ці можна мяне назваць аніматарам, але фактычна так пра мяне гавораць і мушу сказаць, што часам адчуваю на вуліцы, што мяне распазнаюць. Падыходзяць, пытаюць як фатаграфаваць тое ці сёе. Не адва-

працяг ☞4

Санкцыі і рэпрэсіі

Усё ж такі дзяржаўныя чарадзеі-чарнакніжнікі памыліліся з датай правядзення прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Нешта ў зорках не зышлося, нечага ў свеце не здарылася, што павінна было адцягнуць увагу міжнароднай супольнасці ад беларускіх падзей. Не здарылася, як гэта было ў 2001 ці 2006 гадах, не будзем удавацца тут у дэталі. Магчыма, перад новым годам ачмураная Паўночная Карэя павінна была кінуць бомбу на нармальную Паўднёвую, магчыма, адбыцца што-небудзь трагічнае ў іншай кропцы планеты. Але ж прыдворныя астролагі, да якіх так любяць звяртацца таталітарныя рэжымы ўсіх часоў, пралічыліся. У выніку цягам астатняга месяца Еўропа і Амерыка шмат гавораць пра Беларусь. Не адцягнулі ўвагі ад нашай краіны ні падзел Судана, ні паводкі ў Аўстраліі і Бразіліі. Размовы гэтыя, усялякія дэкларацыі пра намеры, знешнія палітычныя заявы ўспрымаюцца рознымі сацыяльнымі групоўкамі ў Беларусі парознаму. Апаненты дзейснай улады, тыя, хто асмеліўся адкрыта выступіць супраць дыктатарскага рэжыму, цудоўна ўсведамляюць, што ўводзіны міжнародных санкцый супраць беларускай дзяржавы адаб'юцца адмоўна найперш на іх. Тым больш, што выразна прагучала: у адказ унутраныя рэпрэсіі супраць палітычных супраціўнікаў улады толькі ўзрастуць. У сувязі з гэтым адным з самых папулярных тэзісаў сярод апазіцыянераў стала выслоўе пра тое, што „каб сапраўдныя міжнародныя санкцыі былі ўведзены гадоў дзесяць таму, то мы ўжо даўно выйшлі б з турмы". Бальшыня аналітыкаў характарызуе дэкларараваныя санкцыі як досыць жорсткія. Вынікаюць яны напэўна з той няздарнай палітыкі „перавыхавання", якую праводзіў Захад, найперш Еўрасаюз, цягам астатніх гадоў. Расчараваныя нематывавана брутальным зыходам прэзідэнцкай кампаніі еўрапейскія структуры і дыпламатычныя місіі, якім доўга дурылі галаву абяцанай лібералізацыяй, зараз імкнуцца ратаваць рэпутацыю і шукаюць новых шляхоў уздзеяння. Санкцыі прапаноўваюцца розныя: візавыя, гаспадарчыя, культурныя, спартовыя. Але нават пры наяўнасці дастатковай палітычнай волі, іх увядзенне — працэс складаны. Папершае, з-за бюракратызаванасці саміх міжнародных структур. Кожнае рашэнне мусіць прайсці доўгую стадыю разгляду. Па-другое, з-за таго, што многія групоўкі і палітычна-гаспадарчыя эліты ўжо завязаны на супрацоўніцтва і маюць у Беларусі свае фінансава-меркантыльныя інтарэсы. Для іх грошы не пахнуць, а лёсы некалькіх дзесяткаў зняволеных у турмах — фактар другасны. Няма сярод членаў Еўрасаюза і палітычнага адзінства. Праўда, так званая інаўгурацыя, ці як яе трапна ахрысцілі „каранацыя", засведчыла цвёрдасць Захаду — усе еўрапейскія амбасадары і вышэйшы амерыканскі прадстаўнік папросту з'ехалі з Мінска і дэманстратыўна не ўзялі ніякага ўдзелу ў цырымоніі.

Дзяржаўныя прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь са свайго боку заяўляюць пра „жорсткія меры" ў адказ на магчымыя санкцыі Захаду. Гэта трэба разумець найперш як узмацненне пераследу грамадска-палітычных актывістаў, журналістаў, ажно да поўнага вынішчэння дысідэнтаў. На іншае сённяшняе кіраўніцтва Беларусі не здольнае. Ну зробяць яшчэ свой спіс неўязных заходніх палітыкаў — ну дык хто гэтага спалохаецца?

Вытанчана геніяльнай у сваіх пазіцыях да Беларусі глядзіцца кіраўніцтва „вялікага ўсходняга брата" — суседняй Расіі. З аднаго боку Крэмль вуснамі сваіх прадстаўнікоў заяўляе пра згоду з пазіцыяй Еўропы ў дачыненні да Беларусі і далучае да агульнага голасу пагрозлівы палец. А вось іншай, шчодрай рукой прапаноўвае Мінску такія крэдыты, якія перакрыюць усе еўрапейскія санкцыі. Палітыка відавочная ў сваёй подлай простасці, якую тым не менш разумеюць нямногія. Але тыя, каму зараз крамлёўскія каланіялісты зашчамілі адну саромную частку цела ў дзверы, разумеюць усё. Усведамляюць і тое, што колькі б воўк ні валок, павалакуць і воўка. Толькі беларусам, якія сталі сапраўднымі заложнікам палітыкі пакрокавага ўцягвання нашай краіны ў расійскую імперскую прастору, ад гэтага не лягчэй. Да чаго ж прывядуць знешнія санкцыі і ці будуць яны ўвогуле, стане зразумела зусім хутка.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Веды падшытыя мовай

У старажытнасці людзі не сумняваліся, што веды гэта хутчэй нічога, чым штосьці. Сёння — наадварот. Ці разумеюць, аднак, якія гэта экстрэмальныя веды? Мяркуючы, вось, што штосьці ведаюць, адразу лічаць, што спазналі або ўсю праўду аб свеце, або амаль усю — у чым заключаецца толькі адна розніца, што або нічога не ведаюць, або г...о ведаюць. А гэты прынцып адкрыў ужо даўно адзін ксёндз-філосаф.

Будучы ў Амерыцы, працаваў я нейкі час з Хесусам. Мексіканцам. І была гэта экстрэмальная праца. Завешаныя на хісткай кладцы некалькі дзесяткаў метраў над зямлёй, мылі мы вокны ў нью-йоркскіх хмарачосах. На ніякія непрыязні з-за вядомых прычын мы не маглі сабе дазволіць, дык размаўлялі адзін з адным вельмі ветліва аб свеце, аб жыцці, аб нашых айчынах. Аб маёй, што паказалася, калі мы віселі на вышыні 42 паверха, Хесус нічога не ведаў. Нават пра тое, што недзе там ёсць нейкая Польшча. Я быў абураны... Як ён, кончыўшы коледж, можа гэтага не ведаць? Я меў ахвоту стрэліць невуку плескача ў патыліцу! Толькі што не пасмеў свайго гневу паказаць — вядома, чаму. Дарэчы, аб Хуарэсе, нацыянальным мексіканскім героі, аб якім з палам расказваў Хесус, я ў сваю чаргу мала ведаў. Прынамсі да свайго невуцтва не прызнаваўся, паколькі аб мексіканска-амерыканскай вайне, у час якой янкі даставалі ад мексіканцаў няблага ў задніцу, штосьці там чытаў. Ну... штосьці там, штосьці там.

Ёсць яшчэ адна катэгорыя ведаў, непералічаная ксяндзом-філосафам, нечужая ўсялякім народам. І хоць яна неабавязкова г...на вартая, неабавязкова варта чагосьці. Гэта веды... мовай падшытыя. Даю прыклад. Папулярнае ў Мексіцы імя Jesus вымаўляецца праз „Х". Таму гаварыўшы, што з Хесусам хадзілі мы ў паб на піва і падчаплялі даўганогіх бландзінак, да нікога не праяўлю непашаны. Інакш з пісаным словам. У час маёй пабыўкі ў Амерыцы махнуў я маленькае апавяданне, якое занёс выдаўцу аднаго з паланійных часопісаў. Той, прачытаўшы першы абзац, нечакана кінуў машынапіс мне ў твар, заверашчаўшы, што гэта скандал. Абзац гучаў наступна: „З Хесусам (лацінкай: z Jesusem) выбіраліся мы да знаёмых дзяўчат на далёкі Бронкс і яшчэ на Брукліне, каб дадаць сабе куражу, забеглі ў першы з берагу паб на шкляначку віскі. Занадта позна аднак, калі дапівалі мы пяты дрынк аказалася, што быў гэта бардэль. Дык выйшлі. На шосты і так не хапіла б нам грошай".

У моўных структурах усіх нацый змяшчаецца нейкі код, які фармуе эмацыянальныя веды аб свеце. Выведзены з культурнага пераказу, які, што б не гаварыць, мае сваю пакаленневую генеалогію і такія ж звышуражлівасці. Пераймаем іх міжвольна. І міжвольна выказваем. Для іспанскамоўных мексіканцаў словы „янкі" і „амерыканец" сіметрычныя па змесце, паколькі называюць канкрэтныя нацыі. Ды трэба бачыць міну Хесуса калі ён кажа „янкі" (пагардліва) або „амерыканец" (з зайздросным захапленнем). Не здзіўляе мяне гэта. Слова „янкі" ці „кацап" з'яўляюцца часткай памяці нашых моў. Памяці, якая часта падводзіць і часта яна ксенафобная, значыць, неабавязкова пахвальная. Хоць... некаторыя называюць яе патрыятызмам.

Маёй натуральнай мовай з'яўляецца польская, што дае ў выніку паланацэнтрычнае бачанне свету. А паколькі мова як пазнавальная прылада адначасова з'яўляецца ўмовай таго спазнання, то на абразлівае слова „палячок", якое кіне нейкі бамбіза, я рэагую фурыяй. Салідарна злуюся на „кацапа" ці „жыдка". І няслушна ў кожным з выпадкаў. Бо гэта так, быццам у свеце глухіх размаўляць на мове жэстаў... пры дапамозе адной рукі. Не сумняваюся, што ў такой жа сітуацыі мае знаёмыя з „Нівы" прымянілі б двухручную аргументацыю — калі ласка, не дашуквайцеся падаплёкі! Гэта вынікае з двухмоўя. Хоць лёгкасць, з якой пераскокваюць яны з беларускай фразы на польскую і наадварот — задзіўляючая, дык дастаецца яна не без жорсткіх досведаў у дзяцінстве. Ды, з другога боку, такія дасведчанні закаляюць розум і робяць яго больш гнуткім, узмацняючы яго інтэлектуальную спраўнасць. І маю на гэта доказ. Шпацыруючы аднойчы з маім двухмоўным знаёмым па беластоцкім бульвары, мы горача штосьці абмяркоўвалі, прычым ён, распалены дыскусіяй, пераплятаў беларускія сказы польскімі, чаго сабе не ўсведамляў. Праходзячыя побач маладзёны падагулілі, прызнаюся, без агрэсіі, гэта так: „O, kacapy rozmawiają". Я, вядома, закіпеў ад гневу. Знаёмы толькі заўсміхаўся. Праз хвіліну, аднак, глянуўшы на мяне, разрагатаўся да слёз...

Мабыць, гэта мая страшная (або страшна смешная) міна так яго рассмяшыла.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Акцыі падтрымкі

Ужо мінула больш месяца ад прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, а ўвесь час працягваюцца рэпрэсіі ў адносінах да ўдзельнікаў дэманстрацыі 19 снежня на мінскай Кастрычніцкай плошчы. Аляксандр Лукашэнка ў інаўгурацыі (без удзелу паслоў дзяржаў Еўрасаюза і ЗША) заявіў, што ў яго краіне ніякай г.зв. каляровай рэвалюцыі не будзе; за нішто мае ён заявы аб увядзенні рэпрэсій з боку ЕС ды абвінавачвае Польшчу і Нямеччыну ў спробе — як гэта назваў — справакаваць пераварот у Беларусі, што сустрэлася з вострым пратэстам абедзвюх дзяржаў.

Тым часам месяц пасля падзей 19 снежня камісія замежных спраў Сейма РП аднагалосна прыняла рэзалюцыю ў справе падтрымкі адкрытага грамадства ў Беларусі. Мае яна быць прынята Сеймам на пачатку лютага. У час пасяджэння камісіі замежных спраў аўтар праекта рэзалюцыі дэпутат ад ПіС Адам Ліпінскі запрапанаваў, каб — згодна з прапановамі, якія прагучалі на канферэнцыі „Ваеннае становішча ў Беларусі. Як да гэтага дайшло і што далей?" з удзелам рэпрэсаваных апазіцыянераў і іх сем'яў — у тэкст увесці заклік да ўлад Беларусі „як найхутчэй правесці поўнасцю дэмакратычныя выбары". Гэтай прапанове супрацівіўся Тадэвуш Івінскі ад СЛД, які палічыў яе празмерным умяшальніцтвам у справы Беларусі. Паколькі дэпутату Ліпінскаму залежала на аднагалосным адабрэнні Сеймам гэтай рэзалюцыі, выключыў гэтую папраўку.

Дакладна месяц ад мінскіх падзей у Варшаве, Кракаве, Познані, Любліне, але і ў Нью-Йорку ці Стакгольме былі праведзены акцыі салідарнасці з арыштаванымі і іх сем'ямі. Беласток маўчаў. Арганізатар пратэстацыйнай акцыі, якая адбылася пасля выбараў 21 снежня пад консульствам РБ у Беластоку, Давід Францкевіч са згуртавання „Polska-Białystok" сказаў:

— Мы рашыліся не арганізаваць у гэты дзень ніякіх акцый. Разам са згуртаваннем „Вольная Беларусь" засяродзімся на дапамозе студэнтам адлічаным з беларускіх вучэльняў за ўдзел у дэманстрацыі 19 снежня. Дапаможам ім паступіць на польскія вучэльні, вырашыць арганізацыйныя пытанні, напрыклад, як атрымаць месца на пражыванне. Акцыю-пратэст пачынаем у лютым.

З затрыманымі і масава пераследаванымі журналістамі выказалі салідарнасць у эфіры Радыё Рацыя журналісты вядучых польскіх СМІ.

— Я хачу выразіць усім калегам з Беларусі, якія змагаюцца за дэмакратыю ў сваёй краіне, сваю салідарнасць. Мы таксама перажылі падобныя сітуацыі, але нам удалося гэта пераадолець і я ўпэўнены, што Беларусь неўзабаве стане дэмакратычнай краінай, — сказаў Яраслаў Гугала, шэф інфармацыйнай рэдакцыі тэлеканала „Польсат", падобна як яго калегі м.інш. з „frondy.pl", Радыё RFM FM, „Głosu znad Niemna", TVN24, „Rzeczpospolitej" і „Gazety Wyborczej" ды радыёстанцый і тэлебачання вяшчаючых на Беларусь. Голас узяла Асацыяцыя польскіх журналістаў. Яго прадстаўніца Барбара Баярын заявіла:

— Акрамя затрымання і арыштаў нашых калег, мы маем справу з замахам на свабоду слова, які заключаецца ў закрыцці адной з незалежных радыёстанцый. Як і дагэтуль мы будзем выказваць сваю салідарнасць з рэпрэсаванымі, якія намагаюцца сумленна пераказаць тое, што адбываецца ў дадзены момант. У набліжэйшы час Асацыяцыя польскіх журналістаў выступіць з адмысловай заявай на гэты конт.

Таксама рэдакцыя „Нівы" выказвае салідарнасць з нашымі калегамі-журналістамі ў Беларусі. Асабліва цяпер мы з Вамі.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Беларускі Музей — што далей?

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы ў мінулым годзе арганізаваў многа фэстаў па вёсках Гайнаўскага павета, ладзіў культурныя мерапрыемствы побач музея і ў музейным будынку, а яго працаўнікі абводзілі турыстаў па музейных выстаўках. Культурная і музейная дзейнасць будзе працягвацца і ў гэтым годзе, але апошнім часам паявіліся ў музеі фінансавыя складанасці, бо ад пачатку снежня мінулага года гайнаўскі прадпрымальнік, які арандаваў велізарную плошчу пад магазін будаўнічых матэрыялаў у вялікім памяшканні былога вытворчага цэха, прытуленага ззаду да музейнага будынка, перастаў наймаць яе. З гэтага часу музейныя ўлады шукаюць новага наймальніка гэтай часткі музейнага комплексу. Арэнда былога цэха была адной з падставовых крыніц фінансавання дзейнасці музея, побач арэнды іншых памяшканняў і датацый Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі і мясцовых самаўрадаў. Выконваючы абавязкі дырэктара музея Тамаш Ціханюк нават не бярэ пад увагу такой магчымасці, што вялікае музейнае памяшканне даўжэй магло б заставацца пустуючым.

Тамаш Ціханюк

— Пустуючая плошча мае каля 500 квадратных метраў. Размовы ў справе яе найму вяліся ў мінулым годзе, але не дайшло да падпісання дамовы. Зараз таксама вядуцца размовы ў гэтай справе і я веру, што вялікае памяшканне не будзе доўга пуставаць, — кажа выконваючы абавязкі дырэктара Тамаш Ціханюк.

У Беларускім музеі можна таксама здымаць начлежныя месцы, харчуючыся ў музейным рэстаране.

— Турысты здымаюць у нас начлежныя пакоі галоўным чынам летам, а ў зімовы час — у святочныя перыяды. Аднак такое размеркаванне прыезду турыстаў наглядаецца ў цэлым нашым рэгіёне, — гаворыць дырэктар Ціханюк. — Зараз, калі мы страцілі арандатара, намнога мацней, чым раней, адчуваем сплату крэдыту размерам прыблізна 2,5 тысячы злотых штомесяц, які мы ўзялі, каб аддаць БГКТ 250 тысяч злотых.

— На гэты год мы атрымылі ўсе датацыі, за якія выступалі ў Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, у гэтым ліку на два штаты ў музеі. Затое нявырашыны яшчэ ўсе конкурсы ў Маршалкоўскай управе ў Беластоку і Гарадской управе ў Гайнаўцы, да якіх мы прыступілі, — заяўляе дырэктар Ціханюк.

Раней дырэктар паведаміў, што звонку фінансуюцца штаты бібліятэкара і бухгалтара (сродкі для іх атрымліваюцца ў рамках рэалізацыі праектаў культурнага характару), а 2,5 музейнага штата фінансуецца з заробленых музеем сродкаў.

Разгарнулі культурную дзейнасць

Дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ды мясцовых самаўрадаў, Беларускі музей у Гайнаўцы ў апошніх гадах разгарнуў культурную дзейнасць як на тэрыторыі музея, так і ў розных гмінах Гайнаўскага павета. У 2010 годзе на тэрыторыі музея ладзіліся тры беларускія фэсты, а пры іх нагодзе майстар-класы ў рамках мерапрыемства „Культура на музейных сходах", у час якіх побач прэзентацыі беларускай музыкі паказвалася праца з ільном, глінай, выконваліся вырабы з бульбы. У Дубінах, Трывежы, Вітаве, Койлах, Трасцянцы, Масеве, Пагарэльцах і Чаромсе-Вёсцы ладзіліся беларускія фэсты з цыкла „І там жывуць людзі".

— Мы стараліся даехаць з фэстамі перш за ўсё ў невялікія вёскі або ў сёлы, у якіх даўно не арганізаваліся фэсты. У час мерапрыемства „Пагоня за фільмам" хацелі мы паказаць сваіх кінематаграфістаў — Мажэну Русачык, Тамаша Анікіюка, Ірынея Пракапюка, а таксама папулярызаваць свае справы, — кажа дырэктар Ціханюк. — Важнымі былі літаратурныя сустрэчы з цыкла „Пісанае кірыліцай", у час якіх з гайнавянамі сустрэліся Міхась Андрасюк, Міра Лукша і Марк Якімюк — рэдактар гайнаўскага „Братчыка". У рамках гэтага праекта мы купляем у нашу бібліятэку кніжкі, якія тычацца нашага рэгіёна, — расказвае Тамаш Ціханюк. — У мінулым годзе мы ладзілі таксама выстаўкі жывапісу, у гэтым ліку адну экспазіцыю прац мастакоў з Беларусі, а таксама фотавыстаўкі. VI Агульнапольскі конкурс „Падляшша ў аб'ектыве" быў найбольш удалым як па ўзроўню конкурсных фотаздымкаў, так і па колькасці дасланых нам прац. Наладзілі мы таксама ажно 20 журналісцкіх і мастацкіх майстар-класаў для вучняў у рамках праекта „Прыгранічны этнічны альянс". Прэзентавалі мы вучням фільмы аб беларускай культуры і фільмавыя рэпартажы з нашых фэстаў. У час „Мастацкіх сустрэч школьнікаў" публіка была задаволена разнароднасцю прапаноў.

Дырэктар Тамаш Ціханюк паведаміў таксама, што ствараецца новы сайт Беларускага музея, бо стары быў вельмі ўбогі як на сённяшнія патрабаванні.

Арганізуецца трэцяя пастаянная экспазіцыя

Зараз у музеі працуюць дзве пастаянныя выстаўкі „Дзень за днём" і „Покі хлеб палажылі на стол". Наведваюць іх турысты, школьная моладзь і гайнавяне.

— Зараз мы арганізуем і калі ўдасца, хочам яшчэ ў 2011 годзе адкрыць трэцюю пастаянную музейную экспазіцыю. Пакажам на ёй нашае рамяство, між іншым, сталярства, кавальства і ганчарства. Ладзім гэтую выстаўку сваімі сіламі, але кансультаваліся ўжо ў яе справе з гайнаўскім мастаком Віктарам Кабацам, будзем раіцца з працаўнікамі Падляшскага музея ў Беластоку, — паведамляе Тамаш Ціханюк.

У час папярэдніх і апошняга з'ездаў музейнага таварыства ставіліся закіды, што ў музейных складах нішчэюць некансерваваныя экспанаты.

— Экспанаты, што знаходзяцца на выстаўках, забяспечаныя і тыя з іх, якія патрабавалі, прайшлі абнаўленне. Сваімі сіламі мы забяспечылі таксама частку экспанатаў, што знаходзяцца на складах, а калі трэба кансультуемся з Падляшскім музеем, — тлумачыць Тамаш Ціханюк.

У час апошняга з'езда музейнага таварыства, што адбыўся 11 чэрвеня 2010 года, Віктар Бура паведаміў, што дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Юрый Кітурка абяцаў даць бясплатную дапамогу Беларускаму музею ў Гайнаўцы, а менавіта бясплатна прымаць у свой музей экспанаты на рэстаўрацыю, а спецыялісты з музея ў Гродне маглі б прыехаць у Гайнаўку і дармова даваць парады.

— За дапамогай у Гродзенскі музей мы не звярталіся, але можа яшчэ зробім гэта. Я думаю, што супрацоўніцтва з Гродзенскім музеем адбывалася б на прынцыпах кансультацый, а такія мы праводзім з Падляшскім музеем у Беластоку. Я не ведаю, ці рэальным магло б быць бясплатнае абнаўлянне і забяспечванне нашых экспанатаў работнікамі гэтага музея, — кажа дырэктар Тамаш Ціханюк. — Пісалі мы і будзем пісаць праекты на музейную дзейнасць, каб дафінансаваць яе, але не атрымлівалі на яе сродкаў і таму зараз арганізуем музейную працу за свае грошы. Аднак я лічу, што мы будзем у змозе разгарнуць у бліжэйшым часе як культурную, так і музейную дзейнасць.

Амаль год у якасці выконваючага абавязкі

— Ужо амаль год працую выконваючым абавязкі дырэктара музея, бо распачаў я работу на гэтай пасадзе з лютага мінулага года, — гаворыць выконваючы абавязкі дырэктара Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы Тамаш Ціханюк і на маё запытанне кажа, што ніхто з музейнай управы не прапанаваў яму стаць пастаянным дырэктарам Беларускага музея. Вясной мінулага года члены старой управы гаварылі, што трэба, каб аб пасадзе дырэктара вырашала новая ўправа. Ад апошняга з'езда мінула ўжо больш чым 7 месяцаў, а новая ўправа так і не вырашыла ці аб'явіць конкурс на пасаду дырэктара музея, ці на гэтай пасадзе зацвердзіць выконваючага абавязкі Тамаша Ціханюка. Каб высветліць прычыну зацяжкі ў гэтай справе звярнуўся я да старшыні ўправы Міраслава Морданя.

— Трэба было часу, каб спраўдзіць ці выконваючы абавязкі дырэктара Тамаш Ціханюк падыходзіць на пасаду дырэктара. Я думаю, што на бліжэйшым пасяджэнні нашай управы вырашым справу дырэктара, а як будзем гэта рабіць, будзе залежаць ад рашэння цэлай управы, — заявіў старшыня музейнай управы Міраслаў Мордань.

Як дапамагаю распаўсюджваць „Ніву”

У 2011 годзе ў Нараўчанскай гміне падпіску на наш беларускі штотыднёвік „Ніву” зрабілі Людміла Савіцкая са Свінарояў, Мікалай Варанецкі з Альхоўкі, Уладзімір Клімюк з Плянты, Ян Харкевіч і Яраслаў Харкевіч з Лешукоў, Яўгенія Аліфер са Старога Ляўкова ды Комплекс школ у Нараўцы.

Не падпісаўся на „Ніву” ні адзін радны, ні адзін солтыс. Няма падпісчыкаў на родны часопіс у Нараўцы, Семяноўцы, Новым Ляўкове, Скупаве, Міклашэве, Тарнопалі, Ахрымах, Міхнаўцы, Масеве і ў Гушчэвіне. Вёскі гэтыя па колькасці жыхароў самыя буйныя.

13 студзеня г.г. я пацікавіўся, як зараз купляюць „Ніву” ў Старым Ляўкове і ў Плянце. У краме ГС быў толькі адзін экземпляр і я яго купіў. У краму ГС у Плянце „Нівы” не прывезлі.

15 студзеня г.г. не зважаючы на дождж паехаў я роварам у Нараўку. Тут у краме ГС пры помніку было два экземпляры „Нівы” і я іх купіў. У той самы дзень прадаў іх жыхарам Плянты і жыхару Старога Ляўкова. Я ведаў, што цікавяцца яны родным часопісам. Былі якраз найбольш зацікаўлены рэпартажам „Цуд маем закладзены ў генах” Ганны Кандрацюк.

Я пастараюся — такое даю абяцанне — каб у лютым у Нараўчанскай гміне было больш „Нівы” ў крамах і каб яе раскупілі. Карэспандэнты могуць і павінны дапамагаць у распаўсюджванні „Нівы”. **Янка ЦЕЛУШЭЦКІ**

Чаромхаўскія інвестыцыі

Сёлетні бюджэт Чаромхаўскай гміны складае суму 11 373 000 зл. на прыбытку, у гэтым ліку 8 926 955 зл. з бягучых даходаў і 2 446 045 з маёмасці. На бягучыя выдаткі прызначаецца 8 496 572 зл., а на справы маёмасці 2 473 704 зл. Перавышэнне даходаў над расходамі складае 402 724 зл. і гэтую суму Гміна прызначае на пагашэнне крэдытаў.

Асноўнымі інвестыцыйнымі задачамі лічацца:

— апрацоўка праектнай дакументацыі на мадэрнізацыю вуліц — 100 тыс. зл. Інвестыцыя будзе рэалізавацца з уласнага бюджэту;

— на санітарную каналізацыю Чаромхі-Станцыі, Ставішчаў і Кузавы прызначаецца 1 830 000 зл., прычым 1 125 000 зл. паступіць з еўрасаюзных датацый, а 705 000 зл. — з гміннага бюджэту;

— рамонт і мадэрнізацыя вясковай святліцы ў Кузаве ў рамках праекта PROW 2007-2013 — кошт інвестыцыі 312 920 зл. (192 343 зл. — еўрасаюзныя сродкі, а 120 577 зл. — з уласных прыбыткаў);

— рамонт і мадэрнізацыя святліцы па вуліцы Фабрычнай у Чаромсе-Станцыі ў рамках праекта PROW 2007-2013 — кошт 105 784 зл. (80 784 зл. — еўрасаюзныя датацыі, а 25 000 зл. — з уласных сродкаў).

З сёлетняга бюджэту 125 000 зл. прызначаецца Старостве на рэалізацыю інвестыцыйных задач, якія тычацца пабудовы і мадэрнізацыі павятовых дарог на тэрыторыі гміны. Апрача згаданых інвестыцый гміна будзе праводзіць рамонт дарог у рамках інтэрвенцыйных работ уласнымі сродкамі і сваім транспартам. **(ус)**

Чаромхаўскія калядні кі

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

„Вечар калядак” — гэта цыклічная імпрэза, якая трывала запісалася ў календары культурных мерапрыемстваў чыгуначнай Чаромхі. Сёлета мерапрыемства адбылося 22 студзеня. Арганізатарам быў Гмінны асяродак культуры. Зацікаўленне імпрэзай, як штогод, так і зараз, было вялікае. Зала была бітком набітая. Шмат дадатковых крэслаў было прыстаўлена ў час канцэрта, але і так многія заставаліся на калідоры пры адкрытых дзвярах.

З прывітальным словам выступіла дырэктар ГАК Барбара Кузуб-Самасюк, якая прывітала шматлюдную публіку і запрошаных гасцей, затым пазнаёміла з праграмай. Першым на сцэну выклікала духавы аркестр, які выканаў чатыры польскія калядкі: „Wśród nocnej ciszy”, „Dzisiaj w Betlejem”, „Tryumfy Króla Niebieskiego” і „Pójdźmy wszyscy do stajenki”. Затым прэзентаваліся самыя малыя каляднікі — дашкольнікі. У іх выкананні прагучалі „Pójdźmy wszyscy do stajenki” і „З новым роком ідэм”. Публіка ўзнагародзіла дзетак бурнымі апладысментамі. Значную групу каляднікаў, а былі імі Вераніка Маркевіч, Барбара Блышук, Наталля Бацюк, Анна Саўчук і Юстына Плясун, складалі вучні Пачатковай школы, якія займаюцца ў музычным гуртку пры Гмінным асяродку культуры. У іх выкананні наперамен гучалі калядкі на польскай мове ды мясцовым дыялекце: „Lulajże Jezuniu”, „Dzisiaj w Betlejem”, „Cicha noc”, „Jezus malusieńki” ці „Добры вэчэр, „Святая Варвара”, „Ой, на моры” ды іншыя. Група школьнікаў пад кіраўніцтвам настаўніцы беларускай мовы Альжбеты Раманчук падрыхтавала сцэнку „Філіпка і ведзьма”. Маладыя выканаўцы, увасобіўшыся ў постаці герояў, вялі сябе так быццам гэта яны раздзялялі лёс маленькага Філіпкі і злой Ведзьмы. Атрымалася цудоўнае, казачнае відовішча. У знак прызнання зала ўзнагародзіла самадзейнікаў бурнымі воплескамі.

У аглядзе прэзентаваліся царкоўныя хары з Чаромхі-Станцыі, Кузавы, Чаромхі-Вёскі ды трыо „Вульчанак” з Вулькі-Тэрахоўскай: Валянціна Верамчук, Надзея Ляўчук і Вера Рошчанка. Усе яны выконвалі сучасныя калядкі („Заспываймо хрыстіяне”, „На зэмлі Господь”, „Добры вечір тобі”, „Святая Варвара” ды іншыя). Адно пеўчая з Чаромхі-Вёскі напомніла калядкі маёй маладосці — „В місты Выфліеме”, „Ныне Адаме” і „Днесь поюшчэ”. Чарамшане вярнуліся да традыцыі вулічнага калядавання і выступілі ў арыгінальных уборах, а на заканчэнне павіншавалі „гаспадароў” (публіку) з наступаючым Новым годам і Ражджаством Хрыстовым ды заспявалі „Многае лета”. Такія ж віншаванні і пажаданні паступілі ад „Вульчанак”. Іхнія калядкі „Шчо то за прэдыво” і „Тіха ноч над Палестыной” былі авацыйна ўспрыняты публікай.

Агляд доўжыўся больш за дзве гадзіны і завяршыўся калядаваннем гурту „Гілочка”. Калектыў пад кіраўніцтвам настаўніцы Ірэны Вішанкі выступіў з гвяздай у народных уборах і выканаў калядкі „Добрій вэчір”, „На рождзэніе”, „На Раздвянэ свята”, „Ой швая тай зазуленька”. Былі таксама віншаванні ды пажаданні ад калектыву, які сёлета будзе адзначаць 15-годдзе дзейнасці на культурнай ніве.

На заканчэнне канцэрта-агляду войт Ежы Шыкула падзякаваў арганізатарам за падрыхтаванне мерапрыемства, а публіцы — за шматлюдны ўдзел і жывое рэагаванне.

1 ☞ працяг

Маладая Гайнаўка (ч. 1)

рочваюся, нават прапаную дапамогу.

— **Часта Цябе ўспрымаюць як палову дуэта двух Тамашоў.**

— Так, шмат рэчаў робім супольна з Томкам і Агнешкай Ціханюкамі (Тамаш Ціханюк — в. а. дырэктара Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы — рэд.). Яны мне дапамагаюць, пішучы праекты, а я ніколі не адмоўлюся ад дакументацыі мерапрыемстваў ладжаных Беларускім музеем. Таксама супольна прыдумалі мы фестываль „Rockowisko”. Сядзелі і думалі, а ў пэўны момант аказалася, што марым пра тое самае. Ёсць на шчасце больш людзей, якім хочацца.

— **Ці лёгка гайнавян выцягнуць з хаты „на культуру”?**

— Вельмі складана, таму так звяртаюся да гэтых хронік. Паказы маглі б прыцягнуць нашмат больш людзей. А пасля такія нядзельныя экскурсіі ў кіно ўвайшлі б у кроў (*усмешка*).

— **Хочаш здымаць гісторыю Гайнаўкі, а як далёка сягае Твая сямейная памяць?**

— Мушу прызнацца, што недалёка. Але напэўна прыйдзе час і на маю гісторыю. Пакуль ведаю, што адны дзяды пераехалі з Крыўца ў Перавалоку за працай. Другія жылі ў Гайнаўцы. Гавару, што прыйдзе час, бо сямейныя лёсы таксама цесна звязаныя з месцамі, якія мяне цікавяць.

— **У Тваёй хаце размаўлялі па-беларуску?**

— Усе гаварылі. Вядома, што да нас бацькі гаварылі па-польску, каб у школе не мелі прыкрасцей. Зараз я не ўмею гаварыць, але вельмі часта, калі сустракаемся ці па справах фестывалю „Rockowisko”, ці калі едзем з Музеем на нейкі фэст, стараемся гаварыць ці загаворваць да людзей па-свойму.

— **А пытанне пра тоеснасць?**

— У хаце пра тое ніколі не гаварылі. Але ведаю, што, здаецца, прапрапрадзед быў з Беларусі, таму ўжо можа варта і час пачаць гутарыць пра тое. Увогуле заўважаю, што зараз большая адкрытасць да такіх размоў, асабліва сярод маладых людзей, якіх сустракаю пры нагодзе музейных мерапрыемстваў. У такіх умовах і мне хочацца ведаць больш пра сябе. Калі езджу з камерай, сустракаю столькі людзей і гісторый. Кожны гадзінамі ўмее пра сябе распавядаць. А я? Пакуль зашмат не магу.

— **Распавядаеш пакуль пра Гайнаўку. Якія ў яе козыры і недахопы?**

— Найбольшы мінус — гэта напэўна супермаркеты. Адмоўным феноменам з'яўляецца турызм, бо ў турыстычным горадзе няма адпаведнай інфраструктуры. А козыры? Гэта людзі і факт, што тут яшчэ можна сапраўды многа зрабіць.

— **Ты выбраў гэты горад свядома.**

— Была нагода выехаць, нават быў спакаваны, але закінуў гэта. Застаўся, нягледзячы на тое, што няма ў мяне працы.

— **Надалей без працы?**

— Так. Але жыву з надзеяй, што можа пачну нарэшце зарабляць робячы тое, што люблю — жыць з фільмаў.

— **Зараз свабодная пасада дырэктара Гайнаўскага дома культуры.**

— Гэта не для мяне. Хачу рашаць пра сваё жыццё, а не пра іншых. Але быць звычайным працаўніком — чаму не.

— **Маеш нейкія вялікамаштабныя планы на будучыню?**

— Раз у месяц не сплю ўсю ноч, тады шмат думак кружыць па галаве. Зраніцы спісваю самыя важнейшыя, але сярод іх далёкіх планаў няма.

Пуодляско-Полеская візыта в Рыё-дэ-Жанэjро

Рэпортаж з колядную экспэдыцыі Дорофея Фіёніка, Ані Фіёнік, Ангеліны Быцько і Томаша Сулімы з Музея Малуй Ойчыны в Студзіводах

„Томэк, бэры апарат! Споткаемся по дорозі. Я прыпаркую самоход". Момэнт, колі одчуваеш, што за хвіліну здеjсніцця штось нэзвычаjнэ. Кунэць куньцёв доехалі, оказалось, в сам тупік подіеj — наша мэта, местэчко Давід-Городок на Століншчыні. Маем 13 студня, половіна одінадцатуй в ночы. Пэрэд намі бодаj найтікавейшэ з'явішчэ обраду вітаня Нового року кругом пару сот кілометраў. На головнуй плошчы Давід-Городка собралось вжэ пару тышчы люді. Нэ туолько зсюль. Потуом дознався, што прысутнічалі гледачы з Менска і другіх городуов Білорусі. Поводом нашого і другіх подорожжа былі *Конікі* — нэ на вырост трэба сказаті, што подея помэняла полескі городок в Рыё-дэ-Жанэjро в час карнавала.

Фотографую, зручно мінаю пары, якіе танцуют, співают, просто добрэ гуляют. Думаю, бэрут мэнэ за свого. Кажды выезд Музея Малуй Ойчыны со Студзівуод всэ на туолько добрэ пудрыхтованы, што нашы атрыбуты натурально мешают нас в лёкальны колорыт. Молодая діевчына, одягнёна в беленьке, казочнэ оденье, позірае на мэнэ, ледь выстаючаго з чугая (!) з башлыком, то з цікавосьцю, то в містычнум зрозуменні друг-друга. Конікі займают шыроку гуліцю — сёго дня машыны ідут в отставку.

Шчэ трыста мэтрув і князі, королевны, мікі-маўсы і другіе мухоморы ўрочысто вуойдут на плошчу, дэ будут прывітаны громкімі бравамі. Чудак в капузі (колі хто нэ знае — нэзвычаjнэ накрыце головы), цыганка і заjчык — ціела моя экспэдыцыйна група в працёвным строю вжэ на месьцю. Ждэм параду Конікув.

Забыв Шановному чытачові прэдставіті героя нашого меропрыемства! Як кажут наjстарэйшыя давід-городчукі (якіх, на маргінэсі кажучы, можна сустрэті на гуліці, колі ворочаются од Леаніда Дранько-Маjсюка), обычай сіеты давны, ёму туолько, куолько конёві на Полессі. Ёму пашана здавна, особліво з часуов Козакуов. Раней бывало буольш скотіны і гэто одбіваецця тожэ в выгляді пэрэопранутых парадовшчыкуов. Хотя інсталяцыя макета головы з пэрэду і заду з... ну самі знаетэ дэ, прыносіт особі повсюльную пошану, то — як казалі нам штогодніе бывальцы — конікуов всё мэнш. Што на тое князь Давід, які з высокого постумэнту на плошчы строго глідіт на собраных? Відно бракуе ёму коня!

Гульня ідэ даліей. На сцэні гурт выдаючы вясёлы, рытмічны звукі, а пуод сцэной товпа народу. Запрашают нас. Но в нас колядная зуорка (одна на плошчы) і мы хочэм заколедоваті. Мусіт нэ того сподівався народ од пуольского гуртка, які співав на іх руоднуй мові. Нэзабывным быв момэнт тостув в клубе, дэ познакомілісь з культурным начальствам імпрэзы і віталі *новы руок* — двойчы. Одін по месцовому часові, другі чэрэз годіну — по студзівуодзкому. Шчодры вэчур продовжывся потанцувкой, а мы в нэвэлічкуй трывозі подаліся до працовніка міліцыі. На нуоч. А што подумалі, арышт?

Ніночка (так ейі зовут людэ) оказалась нэ туолько гостінную, але здзівіло што на головнуй гуліці Століна закладаю одёжу, напамінаючую зайця (з вушамі, конешне!). Колядуем в знакомых чыновнікуов культуры і падаемся далеj, в Пінск.

Бачылі колісь коледовшчыкуов в тэатрові? А, бывае. Замоцовалі сябровство з дырэктарам Пінского Драматычного Тэатру Іваном Базаном (выступав на Белосточчыні з „Пінскою шляхтою" по нашым запрошэнні) і в дорогу. Подорожжэ, особліво экспэдыцыйнэ нэ любіт хуткості. Адчуваючы сэбэ як дома, ночуем в сла-

і співачуй. Одкрыла пэрэд намі гісторыю своюой мамы, одного з найлепшых голосуов Полесся. Новы год после довгуй ночы прывіталі в Давід-Городоцкуй цэркві Казанскуй іконы Богородіцы, побудованый в 1913 годі, ніколі нэ закрытуй в совецкі час. В местэчку стоіт шчэ одін храм —Георгіевскій, з початку XVII веку. Старшых за ёго мнуого на Полессі нэ найдэш. Румочкой віна з настаятелём розвіталісе і подаліся назад, в Столін.

В поворотнуj дорозі мінаем сэло Белавуша, дэ сустрэлі першых колёровых і музыкальных Шчодрыкув, шчэ в дорозі на *Конікі*. Тікаво, поглідіелі на нас, почулі нашу говуорку і взялі нас за падарожнікув з Украіны. Е такіе дні, колі буольш можэш собіе уявіті і на буольш собіе дозволяеш. Пэршы дэнь юльянского року (14 студня), які оказався там вуольны од роботы, е на тое найлепшым доказом. Тому нікого нэ вутых Лесніках, в руодных нам вжэ сэструв Лук'яновіч, якіх музычны альбом свою прэм'еру будэ мев 28 студня в бельскім белліцэі. Добрэ набраті сіл, пожадаті богатого року і — вядомо — заколедоваті.

Шчэ туолько Палацык в Пружані, дэ одбіраем образы пудляского жывопісца Анатоля Кравчука, якого выставу можна было зобачыті там остатнімі месецамі. У Каменцы провіраем вежу. Стоіт — можна вэртатіся додому. Граніця, хто Поляк, хто Беларус, а хто Пуодлешук. В Клішчэль прыганулі нэсподеванку, із-за якуой Шановны чытач нэ дочытав бы і сіетого, і попэрэдніх слуов. Нічого, машына завсёды можэ попсоватіся, головнэ, коб нэ здаватіся. Бэз того нэ вдалася б ніводна наша экспэдыцыя. Што ж... то нэ кунэць пуодляско-полескіх сувязеj. До сустрэчы наступным разом!

Томаш СУЛІМА

Фото автора і Дорофея Фіёніка

Каму дапамога?

Жыхар Кузавы Ян Б. лічыцца інвалідам першай групы (цалкам непрацаздольны і няздатны да самастойнага жыцця). Яму больш за восемдзесят гадоў. Ягоная жонка старэйшая за яго. Старэчы патрабуюць апекі. Калі дачка хадайнічала ў Гмінным асяродку сацыяльнай дапамогі, каб ейнаму бацьку прызначыць пастаянную апеку, дык адмовілі. Чыноўніца сказала, што апека не належыцца.

— Закон не прадбачвае ажыццяўляць над такімі асобамі апеку, паколькі бацька застаецца ў праўным сужонстве, — паясніла.

— Вось табе, баба, аладкі! Паводле закону ЗУС выплачвае пенсіянеру дабаўку пасля заканчэння 75-гадовага ўзросту і лічыць яго цалкам непрацаздольным. Жонка Яна Б. адпавядае гэтым крытэрыям. Аднак іншы закон (аб аказванні сацыяльнай дапамогі) пярэчыць правілам ЗУС, бо кажа ёй апекавацца мужам-інвалідам. На маю думку, гэта заканадаўчая памылка, якую дэпутаты парламента павінны неадкладна выправіць.

Падобную гісторыю пачуў я ад жыхара вёскі Чаромхі Мікалая Панасюка. Сужонству Панасюкам таксама больш за восемдзесят гадоў. Атрымалі яны медалі ад прэзідэнта Рэчы Паспалітай з нагоды 50-годдзя шлюбу. Абое штодзень патрабуюць апекі. Лечацца ў беластоцкіх спецыялістаў. У Гмінным асяродку сацыяльнай дапамогі ў Чаромсе Панасюку сказалі, каб за свае грошы наняў сабе няньку.

Вышэйпрыведзеныя прыклады сведчаць аб недастатках нашага заканадаўства. Тычыцца гэта ўсіх сектараў народнай гаспадаркі, пачаўшы ад чыгункі, а закончыўшы на ахове здароўя. Грамадства патрабуе дакладных законаў, зразумелых не толькі юрыстам, але звычайнаму селяніну ці работніку. Гэтыя заўвагі накіроўваю ў адрас як цяперашніх дэпутатаў, так і кандыдатаў у парламент у надыходзячай выбарчай кампаніі.

Уладзімір СІДАРУК

Куцця ў музеі

29 снежня 2010 года ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы адбылася куцця, у якой прынялі ўдзел адзінокія дзеячы музея, у якіх няма ўжо другой блізкай асобы.

На вячэру ў музей прыйшло каля дзесяці чалавек. Куццю, якая адбылася тут упершыню, арганізавалі працаўнікі музея. Гасцей прывітаў дырэктар музея Тамаш Ціханюк. Ён на самым пачатку прыгадаў асобу светлай памяці Канстанціна Майсені і падзякаваў за вялікі ягоны ўклад у пабудову беларускага музея. Вячэра распачалася ад просвіры. Пасля ўсе супольна спявалі калядкі, узгадвалі час будовы музея і асоб, якія дапамагалі пры будове, а якіх няма ўжо сярод нас.

Спадзяемся, што куцця ў музеі стане традыцыяй, а калі дазволяць фінансы, у наступным годзе больш асоб сядзе за супольным сталом.

Анджаліна МАСАЛЬСКАЯ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Зімовыя канікулы на катку

Першы дзень зімовых канікул. Беласток. Усе дарогі вядуць да гарадской ратушы. А больш дакладна — на плошчу, дзе размясціўся каток. Аматары язды на каньках завіхаюцца тут ад восьмай раніцы. Білет на каток каштуе тры-чатыры злоты. Тыя, якія хочуць зэканоміць, арганізуюцца ў групы і набываюць ільготны білет, або купляюць абанемент на дзесяць сесій. На месцы можна пазычыць (за пяць злотых) канькі. Каток працуе ад восьмай гадзіны раніцы да дзесятай вечара. Паміж трэцяй і чацвёртай пасля абеду — перапынак. Цягам дня мяняецца публіка на катку. Паколькі з раніцы гуляюць дзеткі і арганізаваныя групы, тады вечар належыць маладым і дарослым. Нярэдка закаханыя парачкі дамаўляюцца тут на рандэву. Пасля бачым іх як катаюцца, трымаючыся за рукі. Час ад часу можна пабачыць людзей, якія танчаць на каньках. Гэта, вядома, даніна папулярным тэлеперадачам. Як відаць, мода не абмінула і сталіцы Падляшша. Уласнік катка як умее стараецца дагадзіць мясцовым канькабежцам. Нярэдка па поўнай праграме. Мы маем на думцы папулярную ў рэгіёне музыку дыска-пола, якая падкручвае гульню на катку.

Ля катка кожны дзень праводзяцца турніры, конкурсы, абучэнні. Сёння, напрыклад, паліцыя арганізавала конкурс пра бяспеку на дарозе ў час зімовых канікул. За правільны адказ лаўрэаты маглі сфатаграфавацца з паліцыйнай аўчаркай.

ЗОРКА

Добры дзень, шаноўная рэдакцыя „Зоркі"!

Яраслаў Кастыцэвіч, малюнак Нектарыя Юрчука

Мяне завуць Аня Нікіцюк, я вучаніца другога „ц" класа Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім. Я часта чытаю „Зорку", а сёння адважылася першы раз напісаць ліст у рэдакцыю. Я хацела б падзяліцца з чытачамі „Зоркі" маімі ўражаннямі ад цікавага ўрока беларускай мовы, якія адбыўся ў нашым класе ў снежні.

15 снежня 2010 года нашу школу наведаў вельмі шаноўны і паважаны прафесар Алег Латышонак з Універсітэта ў Беластоку. Вучні нашага класа і класа другога „д" вельмі цешыліся з гэтай сустрэчы, таму што меў быць урок не з настаўнікам нашай школы. Мы ўжо раней даведаліся, што спадар Алег Латышонак — гісторык з багатымі ведамі аб мінулым нашай Малой Айчыны. Некаторыя з нас чулі ад сваіх старэйшых сяброў або сям'і, што лекцыі прафесара вельмі цікавыя. Спадар Алег Латышонак расказаў нам пра гісторыю Слуцкага Збройнага Чыну. Мы даведаліся хто прымаў удзел у гэтым патрыятычным паўстанні і маглі ўбачыць герояў на старых архіўных фотаздымках, якія спецыяльна для нас падрыхтаваў прафесар, вечарам, да нашай сустрэчы. Мы даведаліся з кім і за што змагаўся беларускі народ. Гэты ўрок быў настолькі цікавы, што нават тыя мае сябры, якія спачатку не зусім уважліва слухалі, хутка зацікавіліся сустрэчай і займальным расказам прафесара.

Я сама ніколі дагэтуль не сустрэлася з чалавекам, які з такой жарсцю і ангажаванасцю гаворыць пра свае зацікаўленні. Не кожны мае такую нагоду, каб, будучы гімназістам, слухаць лекцыі прафесара. Прафесар прыблізіў нам у простых словах трагічную, але займальную праўду аб нашых продках. Найбольш здзівіла мяне тое, што патрон нашай школы Яраслаў Кастыцэвіч таксама быў удзельнікам Слуцкага Збройнага Чыну.

Шчыра дзякуем спадару Алегу Латышонку за так займальны ўрок і чакаем падобных сустрэч на ўроках беларускай мовы.

Аня НІКІЦЮК

Ад рэдакцыі: Прывітанне Аня! Твой допіс сведчыць, што ў вашай школе ёсць маладыя людзі, якім неабыякавыя наша гісторыя і мова. Пішаш пра цяжкія справы лёгка і займальна. Гэта цэнная якасць. Чакаем чарговых допісаў і лістоў.

Зорка

Хавай нос у Апанасаўскі мароз!

Так гучыць прыказка, звязаная з днём *Апанаса* (31 студзеня). *Апанаса* называлі абаронцам жывёлы ад маразоў. Якраз заканчваў ён самы халодны месяц зімы.

На Смаленшчыне гэты дзень называлі „гусіным святам". Карацей, было пажадана, каб у гэты дзень выпаў свежы снег, як белы пух. Гэта прадказвала багаты на развод гусянят год!

На *Апанаса* сачылі за надвор'ем. Паводле стану надвор'я людзі прадказвалі надыход вясны і пачатак палявога сезона. Калі была завіруха — гэта абазначала, што вясна будзе працяглай і запасы ў клуні будуць „вымецены". Апанас быў вельмі важным для сялян, каб разбірацца ў „эканоміі". Да гэтага дня яны маглі скарміць толькі палову кармоў: сена, буракоў, збожжа. Калі запасы былі зменшаны больш чым напалову, гэта абазначала недастатак вясною. Жывёлу пачыналі карміць больш ашчадна.

Сёння вяртаюцца падобныя спосабы для вызначэння надвор'я, дык можа і вы паспрабуйце запісаць прыкметы на *Апанаса*, а пасля праверце ці яны спрацавалі ў прыродзе.

ЗОРКА

Патоп і вернасць

(казка з Танзаніі)

Калі малады паляўнічы ажаніўся, яго маці падумала: „Будзе дапамога ў гаспадарцы". Два тыдні ад шлюбу яна рашыла сказаць маладой гаспадыні пра сямейныя сакрэты. Свякруха ўзяла дзяўчыну за руку і павяла ў камору. Там стаяў непрыкметны збан з гліны.

— Глядзі, каб ніхто не дакрануўся да гэтага збана, — прашаптала старая, — інакш усё сапсуеш ды бяды якой наклічаш...

— Цяпер я ўсё разумею, — маладая нявестка аж пляснула ў далоні ад радасці...

— Ты мала што яшчэ разумееш, — абачліва правучыла старая. — Пакуль паабяцай, што ніколі не дакранешся да гэтай пасудзіны...

— Абяцаю! — прачшабятала маладая. — Абяцаю, мамачка!

Так рассакрэцілася першая тайна ў гаспадарцы. Да гэтай пары маладая гаспадыня не разумела адкуль у іх хаце вада. Ні яна, ні свякроў не хадзілі, як іншыя жанчыны з іх вёскі, да крыніцы, тут даставалі ваду „аднекуль". Чарадзейны збан адкрываўся адно на закляцце свякрухі. Яна адна ведала як „наліць" з яго вады. Дзяўчына падумала: „Папала як пончык у масла!". Вада ў хаце даражэй усякага золата...

Аднойчы свякруха падалася да сваякоў у суседнюю вёску, а маладая гаспадынька стаяла ля гаршкоў і рыхтавала страву. І як на злосць спатрэбілася ёй вадзіца. Маладуха паленавалася ісці да крыніцы. Доўга не думаючы, пайшла ў каморку наліць гатовай вады са збана. Як толькі дакранулася да пасудзіны, збан лопнуў і разбіўся ў дробны пыл. І гэта не канец... З таго месца прарваўся ручай, які найперш затапіў іх хату, а пасля ўсю вёску і палі з агароднінай і збожжам. Свякруха, якая была далёка ад хаты, адчувала, што здарылася няшчасце. Яна дабыла з кішэні чарадзейныя зёлкі, ды, кідаючы іх у агонь, прыгаворвала: „Хай загіне тая, што парушыла прысягу! Хай ацалеюць усе апошнія, якія не вінаватыя ў патопе!". Замовы падзейнічалі. Ніхто з людзей не патануў, усе паспелі ўцячы ад стыхіі. Вядома, апрача адной маладой гаспадынькі, якая не стрымала слова. Людзі перайшлі жыць у іншае месца, а там, дзе калісь стаяла іх вёска, зрабілася возера Ікімба. Яно напамінае нам пра жахлівае здарэнне і пра ісціну — навошта трэба стрымліваць слова, якое даем іншым.

ЗОРКА

www.wordpress.com

Музыка з кайфам

Карнавал у белліцэі

http://www.arka-przymierza.org.pl

Сёння ў „Музыцы з кайфам" незвычайна: запрашэнне. Ужо ў бліжэйшую пятніцу Бельскі белліцэй адкрываецца на „Сямейную сустрэчу". Каму ў Бельск-Падляшскі блізка ці па дарозе — не абміньце!

Беларускі ліцэй у Бельску любіць прымаць сваякоў. Неаднойчы доказам гэтаму былі з'езды выпускнікоў ліцэя. Ёсць тады час на ўспаміны, гутаркі, гульню. У бліжэйшую пятніцу пагуляць будзе можна поўнымі грудзямі, а падыгрываць да танцаў будуць Віктар Касьянюк з Навіцкавіч (вёска каля Камянца ў Беларусі), Мацей Філіпчук з Познані і добра вядомы Дарафей Фіёнік са Студзіводаў. **Пагулянка гэтая з'яўляецца часткай, а заадно фіналам гэтак званай „Сямейнай сустрэчы"**, якую рыхтуюць Аб'яднанне „Музей Малой Бацькаўшчыны" ў Студзіводах, Фонд „OIKONOMOS" ды Белліцэй. Чаму з націскам на сямейны характар гэтага мерапрыемства? Гэта якраз па прычыне кніжкі Чэслава Андрэя Хайнацкага „Назвы кроўнасці і сямейнага сваяцтва ў гаворках жыхароў ваколіц Бельска-Падляшскага", якая будзе тады прэзентавацца. **Калі часам пяты раз чуеце пра нейкага Віцю ад Нікадэмавых ці Маньку з-за рэчкі і надалей не разбіраецеся, хто ёсць кім** і пра каго з бліжэйшай ці далейшай сям'і размаўляюць бацькі ці дзядулі ў час сямейных мерапрыемстваў, варта выбрацца на такую адкрытую „Сямейную сустрэчу". Можа нарэшце знойдзецца хтось, хто патлумачыць, чаму так гаворыцца!

Але ж „Сямейная сустрэча" гэта не толькі танцы і ламанцы (галавы), гэта таксама песні. Калектыў „Жэмэрва" ды трыо сёстраў Лук'яновіч з беларускага Палесся будуць прэзентаваць **новы альбом „Песні і музыка Пудляшша і Полесся"**. Ведаючы студзіводскіх вакалістаў, і будучы наведвальніцай студзіводскіх фестываляў можна быць упэўненым, што спеў гэты будзе проста раздзіраць кашулі, а прытым і ўдзельнікам сустрэчы будзе нагода паспяваць.

Карнавал дык карнавал. Нават у школе можна добра пагуляць!

i_basovka@o2.pl

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Іаанна Федарук (V „ц" клас Комплексу школ з беларускай мовай навучання № 3 у Бельску-Падляшскім).

2. Твой любімы прадмет: беларуская мова.

3. У жыцці хачу стаць: танцоркай.

4. У сяброў цаню: шчырасць і дабрыню.

5. Не люблю: агрэсіі.

6. Па-беларуску размаўляю: з бабулямі, бацькамі, сястрой.

7. Кніжка, якая цябе захапіла: „У Алі ёсць кот" Малгажаты Будзынскай.

8. Падабаецца табе музыка: беларуская музыка.

9. Твае ўлюбёныя стравы: кожная страва мае свой смак і характар.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: люблю плаваць і слухаць музыку.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Бельску-Падляшскім.

Польска-беларуская крыжаванка № 5

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 1:

Санкі, схоў, мост, вясёлка, калядка, ар, мяжа, муж. Твар, на, ял, сям'я, мёд, толк, сказ, хата, Парыж.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Паўліна Паплаўская, Кацярына Верамяюк, Дыяна Галёнка, Віялета Дработка, Магда Міхалевіч, Магда Марчук, Кася Дзяржаноўская** з Бельска-Падляшскага, **Караліна Васілюк** з Гайнаўкі, **Юстына Вакулюк, Крыстыян Грушэўскі** з Арэшкава. Віншуем!



ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫ АКЦЁР

Размова з ураджэнцам Беластока, жыхарам Кракава, акцёрам ***Эдвардам Любашэнкам***

„Ніва": — *Калісьці Вы расказвалі пра сваё хуліганства. Любіце яшчэ пахуліганіць?*

Эдвард Любашэнка: — Ужо не, і гаворка тут не пра тое, што не люблю, ды ўжо не маю сілы. У маім узросце, значыць, на 71 годзе жыцця, з гэтым цяжкавата.

— ***Як сёння глядзіце на свой Беласток?***

— Я штораз больш ганаруся гэтым горадам. Што і руш Беласток бачу, напрыклад, у рэкламах. Беласток стараецца быць сярод вядучых гарадоў краіны. Я заўсёды гаварыў, што я з Беластока, што асабліва кракаўскіх таксістаў ашарашвала. Я нарадзіўся восем дзён перад вайной і з'ехаў адтуль, калі мне не было яшчэ двух гадоў. Апынуўся ў глыбі СССР у Архангельску, а пасля на Украіне, дзе жыла маці майго айчыма Мікалая Любашэнкі, а пасля былі Брэст і Вроцлаў.

— ***А якія Вашы карані?***

— Аб родным бацьку Юльяне Ліндэ даведаўся я аж ва ўзросце 18 гадоў. Мама і яе сям'я родам з Баранавіч з польска-беларуска-літоўскай тэрыторыі. Калі ў 1957 г. мой бацька [Юльян Ліндэ, па паходжанні немец, беластачанін, быў прызваны ў Вермахт — М. Х.] выцягнуў мой акт нараджэння, аказалася, што гэта была Віленская архідыяцэзія. Частка сям'і майго дзеда Рашкоўскага пасялілася на літоўскім баку, а дзве сястры маёй мамы выйшлі замуж за беларусаў, адна стала жыць у Мінску, другая ў Гродне. Так вось я пакрысе паляк, літовец, беларус і немец.

— ***А кім быў Мікалай Любашэнка, Ваш айчым?***

— Афіцэрам Чырвонай Арміі, прапісаным у доме маёй мамы. Сёння Нямеччына далёка ад Беластока, да вайны была недзе 80 кіламетраў адсюль. Бабуля з боку Мікалая была чэшкай. Паміж мамай і Мікалаем наладзіўся раман. Мікалай не быў беларусам ці расіянінам, а ўкраінцам з расійска-ўкраінскага памежжа, дзе пражывалі русіфікаваныя ўкраінцы. Канчатак у прозвішчы як у Лукашэнкі.

— ***А што было пасля?***

— Калі выбухла нямецка-савецкая вайна, мой айчым быў камандзірам роты, якая ахоўвала станцыю Беласток-Таварны. Каб усцерагчы сям'ю ад вайны 1941 года, айчым пасадзіў нас у санітарны вагон-салон едучы на ўсход з картачкай, што з'яўляемся сям'ёй Любашэнкаў. І так мы апынуліся ў Архангельску. Пакуль было вызначана, што мама з'яўляецца жонкай савецкага афіцэра Мікалая Любашэнкі, меліся мы вельмі цяжка. Мама пайшла ў армію Берлінга, а мяне пакінула ў Архангельску ў дзетдоме. Рэгулярна ўплачвала грошы, таму пільнавалі мяне як вока ў галаве. Удалося ёй спачатку мяне, пасля Мікалая забраць у Польшчу. Раней аднак, калі мне было пяць гадоў, мама перавезла мяне ў Каламак на Украіне, дзе жыла маці Мікалая Любашэнкі. Я тады гаварыў па-руску, а яны, калі хацелі пахітрыць, каб я чагосьці не разумеў, гаварылі па-ўкраінску. Нават не заўважылі, калі я ўжо разумеў, што яны гавораць. Адтуль я памятаў, што там было намнога цяплей, чым у Архангельску, чаго вынікам былі, дарэчы, шматлікія апёкі летам. Пасля перавезлі мяне ў Маскву да братанка Мікалая Любашэнкі. Тут сустрэў мяне канец вайны. Пасля атрымання рэпатрыяцыйных дакументаў мама, як ваенны асаднік, разам са мною і Мікалаем Любашэнкам трапілі, на жаль, ужо не ў Беласток, а ў Вроцлаў. Мама бывала яшчэ ў Баранавічах у сясцёр у шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады. Рабілі ёй гінекалагічны абзор на мяжы, ці мо золата не перавозіць. Там, у Баранавічах, заўсёды пражывалі людзі, у якіх двайная ідэнтыфікацыя, не ведаючыя да канца ці яны беларусы, палякі ці можа ліцвіны.

— ***Спазіраеце сёння на Беларусь?***

— Я заўсёды хвалююся, слухаючы пабеларуску песень аб Белавежскай пушчы. Маю жаль да беларускіх улад, што асушылі Беларусь. Хацелі зрабіць нейкі парадак з багнай, а толькі давялі да яе знішчэння, да прапажы каштоўных відаў фаўны і флоры. На жаль, не бываю ў Беларусі, таму што баюся. Але стараюся мець кантакты з беларусамі. Меў я нядаўна студэнта з Беларусі ў кракаўскай тэатральнай школе.

— ***Дзе кончыцца Заходняя Еўропа?***

— Кончыцца, значыць канае, ці дзе яе мяжа?

— ***Дзе яе мяжа.***

— Перш за ўсё Заходняя Еўропа трымаецца астаткам сіл. Я не прадбачваў, што пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз адносіны з Усходам будуць заключацца на безупыннай вайне ці то з Расіяй, ці з Беларуссю. Калі абмяркоўваў, дзе правесці свой юбілей сямідзесяцігоддзя, думаў пра Мінск ці Баранавічы, але баяўся туды ехаць без аховы.

— ***Дзякуем за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Кіно-вока пасярод Беластока

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У аўторак 16 студзеня роўна ў поўдзень, на скрыжаванні вуліц Легіяновай і Складоўскай-Кюры ў Беластоку, была адкрыта мастацкая інсталяцыя Аляксандры Чарняўскай, якая спасылаецца на творчасць народжанага ў Беластоку піянера сусветнага дакументальнага кіно Дзігі Вертава — Давіда (Дзяніса) Абелевіча (Аркадзевіча) Каўфмана (2.01.1896-12.02.1954). Кадр з культавага фільма „Чалавек з кінаапаратам" — з вокам і аб'ектывам — у венецыянскім люстры глядзіць і адбівае свет цэнтра Беластока.

Аляксандра Чарняўская

Аляксандра Чарняўская ўжо пры канцы мінулага года ўсталявала інсталяцыю, інспіраваную творчасцю зачароўваючага яе аўтара, якая з'яўляецца завяршэннем яе дыпломнай працы ў Акадэміі мастацтваў у Варшаве, па заказе Галерэі „Арсенал". „Гэта выдатны дакументаліст, цікавіў яго адмысловы рытм горада", — захапляецца Оля Чарняўская. Нетыповы аб'ект памерам 2 на 3 метры з'яўляецца гульнёй бачання на некалькіх узроўнях — з аднаго боку гэта карціна, з другога боку — можна ўбачыць сваё адлюстраванне або тое, што адбываецца насустрач. У венецыянскім люстры ў залежнасці ад пары дня і надвор'я, адбіваецца вобраз або прапускаецца святло, паказваючы тое, што ўнутры. Надрук з другога боку — накладзена адно на адно адюстраванне вока і аб'ектыву. Зблізку відаць чорныя малыя кропкі, а кадр з „Чалавека з кінаапаратам" можна ўбачыць з пэўнай адлегласці.

На ўрачыстым адкрыцці інсталяцыі паявілася група старэйшых беластачанак, якія пратэставалі супраць ініцыятывы ўвекавечання гэтага беластачаніна. Адна з жанчын у капелюшыку з прыкушанымі вуснамі насіла партрэт Леніна з заклееным па-пірацку вокам: Вертаў, паводле яе, быў „вокам Леніна" і моцна кахаў ідэі бальшавізму. Іншая (пажылая дзеячка культуры і антыкамуністка) на сваім транспаранце пыталася „Ile kosztuje oko Lenina podatnika białostoczanina". Пасля пачалася дыскусія на форумах пра тое, ці мелі рацыю пратэстуючыя „мохеры". Адзін з дыскутантаў лямантаваў: „Гэты Дзіга Вертаў, якое дурное імя і прозвішча, нейкі кацап і бальшавік". Другі, якому не ў смак „усходні" напрамак Беластока, пекліўся: „Штось не так тут адбываецца: той стракаты зубр [Лявона Тарасэвіча — М. Л.], цяпер вокаленіна... Можа так ад разу прылучыць і гуляць у праслед (podchody), Сталін зробіць гэта адной рысай алоўка". Оля Чарняўская: „Гэты рэжысёр малавядомы ў сваім родным горадзе. А фактычна гэта адзін з найважнейшых аўтараў у гісторыі кіно. Беласток павінен ім хваліцца".

Нарадзіўся Давід Каўфман у сям'і беластоцкіх інтэлектуалаў (маці Фэйгла, бацька Авель быў букіністам, меў кніжны склад і дзве кніжныя крамы), вучыўся ў кансерваторыі. У 1915 годзе эміграваў з усёй сям'ёй у Расію. Вучыўся ў Петраградзе ў медыцынскай акадэміі. Свае першыя кінаматэрыялы пачаў мантаваць ва ўзросце 22 гадоў, у заснаваў групу „Кіно-Глаз". Прамаваў ідэю супрэмацыі аб'ектыўнага кінаапарата над суб'ектыўным і калекім людскім вокам. Аб'ектыў камеры лічыў ідэальным вокам, дзякуючы якому свет можна ўспрыняць у новы, аб'ектыўны і заадно экспрэсіўны спосаб. Давёў да майстэрства наватарскія тэхнікі мантажу, падзелу карціны, суперімпазіцыі, дзякуючы якім атрымліваў задзіўляючыя спецыяльныя эфекты. Займаўся і тэорыяй кіно. Разам з братам Майсеем (Міхаілам) здабылі пазіцыю вядучых аўтараў авангардных і прапагандысцкіх фільмаў. Давід памёр у Маскве ў 1954 годзе, Міхаіл — у 1979 г. Трэці з братоў Барыс (Барух) Каўфман вярнуўся быў у Польшчу, у трыццатыя гады штудзіраваў у Сарбоне, пасля вайны выехаў у Канаду і ЗША. Працаваў у Галівудзе пры м.інш. дзесяці вялікіх фільмах. У 1955 г. атрымаў прэмію Оскара за здымкі фільма Эліі Казана. Памёр у 1980 г. у Нью-Йорку.

Часопіс „Entertainment Weekly" ў кастрычніку 2010 года апублікаваў спісак 12 дакументальных фільмаў змяніўшых свет. У рэйтынг самых уплывовых дакументальных фільмаў (11 месца) увайшоў савецкі эксперыментальны фільм Дзігі Вертава з 1929 года „Чалавек з кінаапатарам", расказваючы пра жыццё Адэсы.

Дзіга Вертаў выдумаў свой псеўданім яшчэ ў Беластоку — ад цацкі юлы-дзыгі (бонка, ваўчка), якая верціцца — ад таго і Вертаў. „Додзя" рысаваў сімвалічныя карціны, пісаў вершы, ствараў музычна-паэтычныя кампазіцыі на музыку Скрабіна. А прытым выкарыстоўваў рэальныя гукі жывога жыцця. Гучны і дынамічны псеўданім спадабаўся маскоўскім і піцерскім футурыстам. Пра жыццё трох братоў Каўфманаў — як мяркуюць некаторыя крытыкі — самых цікавых братоў у сусветным кінематографе — можна было б паставіць не адзін фільм. І ганарыцца імі павінен „уязны гарадок у Гродзенскай губерні". Дарэчы, нашы мяшчане-радныя крывіліся і на Чэслава Мілаша, асабліва святошкі ў капелюшыках з зацятымі мінамі, а вуліца яго імя — ёсць. А ці больш вядомы ім Мілаш ад братоў Каўфманаў?

Тэатральныя пачаткі ў Орлі

Міхал МІНЦЭВІЧ

Назіраючы сённяшняе жыццё ў Орлі (ды не толькі) відаць, што мала каго (калі мо і зусім) з дарослых цікавіць тэатр, нейкі від тэатральнага мастацтва. Праўда, вельмі нямногія прынамсі раз за сваё жыццё (пры нагодзе працоўнай ці школьнай экскурсіі) былі ў сапраўдным тэатры. Мабыць таму ніхто з нашых ваколіц не стаў прафесіянальным акцёрам.

А пры санацыі? Ва ўспамінах пажылых людзей захаваўся ў памяці візіт у Орлю аднаго тэатра, быў ён з Украіны. Спектакль адбыўся ў жыда Мошка Вадзілоўскага па вуліцы Бельскай, які частку свайго дома адвёў мясцоваму насельніцтву на танцавальныя забавы і іншыя мерапрыемствы. Трэба таксама адзначыць, што азы тэатральнага мастацтва засвойвалі і выступалі на сцэне вучні тадышняй пачатковай школы; захаваліся нават здымкі з таго часу.

У пасляваенны час у вёску заглянуў тэхнічны прагрэс. Спачатку былі гэта г.зв. точкі, падключаныя да расцягнутай на слупах кабельнай сеткі прыёмнікі, якія перадавалі толькі адну праграму ў акрэсленых адрэзках часу. У 1955 годзе Ваяводская ўправа сувязі — на пісьмовую просьбу Яна Кубаеўскага — згадзілася весці мясцовую перадачу з будынка тадышняй арлянскай пошты. Па правадах паступалі прамыя канцэрты пажаданняў (выступаў калектыў мандаліністаў-спевакоў „Арляне") ды кароткія паведамленні з тэрыторыі Грамады Орля. Усе яны мусілі раней атрымаць дазвол Рэдакцыйнага камітэта пры прэзідыуме Грамадскай рады.

У той час людзі вельмі гарнуліся да ўдзельніцтва і творчай працы на ніве мясцовай беларускай культуры; радавыя работнікі кафлярні нават заснавалі і вялі свой тэатр. Быў задор і самадзейнікі лічыліся ўжо „кімсьці", здабывалі рэнамэ.

Калі паявіліся тэлевізары, былі яны разынкамі толькі ў нешматлікіх хатах. Вяскоўцы, каб пабачыць тэлеперадачы, звальваліся табуном да таго, у каго ўжо тэлевізар быў. І глядзелі яны ўсё, што толькі тэлебачанне паказвала, у тым ліку і тэатральныя пастаноўкі.

Галіна Багацэвіч з роду Адзіевічаў, народжаная ў 1925 годзе ў Орлі, так успамінала той час:

Пры санацыі ў школу хадзіў хто хацеў. Але таго, хто сваіх дзяцей у школу не пасылаў, маглі аштрафаваць. Калі бацькі адносіліся да навукі сваіх дзяцей абыякава, тады найчасцей яны пакідалі школу. Уніформаў тады не патрабавалі і кожны апранаўся ў тое, што меў, часцяком хадзілі нават басанож. Затое кожны мусіў насіць школьную метку (tarczę). У школе была дысцыпліна, хаця занадта нас не каралі, у прынцыпе стаўлялі на калені. Я сядзела за адной партай з жыдам, Іцхакам Бергманам.

Дырэктарам школы быў Тадэвуш Врублеўскі, (які выводзіўся з мястэчка Едлічы каля Горліц — М. М.); навучала таксама ягоная жонка Марыя (з Валыні — М. М.). Былі Мілерова, Адамчыкаўна — вяла гарцэрства, Бялецкі — такі старасвецкі настаўнік матэматыкі. Уладзіслаў Акушка з Бельска вёў духавы аркестр пажарнікаў, а ягоным партнёрам быў нейкі Дэмбіцкі, які праз нейкі перыяд быў загадчыкам школы. Многія настаўнікі кватараваліся ў Ляшэвіча. У Купталя, мясцовага фельчара, жыў рэгент хору Далкоўскі. Не быў ён хіба надта рэлігійны, калі развучваў з намі напрыклад такую песеньку: Tam na górze jawor stoi,/Jawor zielonieńki,/Płacze kozak w obcej stronie,/Kozak .../Niech mnie nie chowają/ Popy ani diaki,/Jeno same ukraińskie/Grzebią mnie kozaki.

1930-я гады ў Орлі. У школьным тэатры выступаюць (злева направа ў верхнім радзе): Зіна Якімовіч, Данута Врублеўская, Надзея Кудэрская, NN, (у ніжнім); Галіна Адзіевіч, NN, Надзея Нестаровіч, NN

У школе было гарцэрства. Неяк так склалася, што я найбольш вылучалася сярод праваслаўных вучняў. Уключалі мяне ў розныя тэатральныя пастаноўкі, была я нават застэмповай, а мой атрад называўся „Jaskółka"; апошнія застэмповыя былі каталічкамі, дружыновай была Яська Рыбак. Помню, як выбраліся мы ў Белавежу на трохдзённы бівак. Гулялі мы ў пушчы ў подступы, а ноччу, трасучыся ад холаду, стаялі на варце.

Галіна Адзіевіч-Багацэвіч

У школу пайшла я ў шасцігадовым узросце, а ў трынаццаць гадоў закончыла я сем класаў. Мае бацькі — Дуня і Аляксандр — казалі: ідзі вучыцца далей, будзе лягчэй; але я іх не паслухала. Мой старэйшы брат Толя прабаваў паступіць у падафіцэрскую школу, але там сказалі, што не хапіла яму некалькіх сантыметраў росту. Як там было ў сапраўднасці — не ведаю; мо не прынялі яго, бо быў праваслаўны... Такім чынам з тройкі нашага сямейства далей вучыцца не пайшоў ніхто. Малодшага брата Яраслава бацька выслаў вучыцца кушнерству ў Бельск, а мяне мама паслала вывучаць кравецтва ў арлянскай яўрэйкі Фейгі Фукс.

Ніводная з маіх сяброўак пры санацыі пасля пачатковай школы далей не вучылася. З Орлі толькі Барбара Бабулевіч пайшла ў гімназію, але яна была сіратой і за яе навуку плаціла гміна. Яшчэ пры санацыі выйшла яна замуж за Базыля Лашкевіча, які быў тады адзіным праваслаўным настаўнікам (але быў ён з-па-за Орлі), а пасля сама навучала ў арлянскай школе.

З мая ў школе заўсёды быў святочным днём. Жыдоў вялі тады ў жыдоўскую школу, каталікоў у каплічку (месцілася яна тады ў будынку сірацінца, у якім пасля вайны ўсталявалася гмінная ўправа — М. М.), а нас, праваслаўных — у царкву. Перад тым была лінейка, г.зв. capstrzyk, пасля іграў духавы аркестр пажарнікаў (у якім на працягу нейкага часу іграліі вучні заміж дарослых, калі тыя трапілі ў турму за палітыку — М. М.).

У школе навучалі нас рэлігіі. Прыходзіў бацюшка, але навучаў не па-польску, толькі так, як гаварыў у царкве, па-расейску, па-стараславянску. У той час бацюшка за свае паслугі рэдка атрымліваў зарплату ў грашах. От, вынясе яму чалавек сітка (такая была тады мерка) збожжа, некалькі яек. Па калядзе бацюшка ездзіў конным возам, у які збіраў усе тыя дары.

З жыдамі жылі мы добра. Сярод іх былі багатыя і бедныя („лахудры"). У Орлі быў яўрэйскі лекар Браўн з Варшавы, яўрэйскі аптэкар... Да Гуса — жыў па-суседску з намі — які навучаў яўрэйскіх дзяцей іўрыту, хадзіў вучыцца мой брат Анатоль; быў гэта добры жыд. Нашы дзяўчаты хадзілі ў шабас да жыдоў распальваць печы ці гасіць свечкі. За такія паслугі атрымлівалі яны булкі, а часам грошы (дзесяць грошаў ад печы — М. М.).

У той час маладыя дзяўчаты і хлопцы самі не выбіралі сабе жыццёвых партнёраў. Былі спецыялісты — сваты, якія падказвалі выбар. Тыя падказкі трэба было шанаваць, хаця неабавязкова ім падпарадкоўвацца, так што па-рознаму з гэтым бывала. Тады таксама наракалі, што калісь дзеці былі больш паслухмянымі...

Сужонстваў, мешаных у рэлігійным плане, было ў Орлі нямнога. У мястэчку дваіх праваслаўных пажаніліся з яўрэйкамі (Аляксандр Мартыновіч з Гітляй, Уладзімір Рэнгайла з Шыфрай — мелі дачушку, ды Павел Гонта з Міклашоў з Гільдай — мелі трое дзяцей — М. М.). Праваслаўныя жаніліся таксама з каталічкамі. Тады так было прынята, што праваслаўны пераходзіў у каталіцтва. Людзі, хаця былі бедныя, аднак жылі з сабою ў згодзе — жыды, праваслаўныя, каталікі...

Людміла Ёдла з роду Качынскіх, народжаная ў 1926 годзе ў Караліне каля Шчытоў, зараз жыхарка Бельска-Падляшскага, так успамінала пасляваенныя гады ў Орлі:

У пачатковую школу хадзіла я ў Орлю. Памятаю тадышніх настаўнікаў: Бялецкага — вучыў рахункаў, Галену Барлагову (ейны муж быў вядомым фатографам — М. М.), Базыля Лашкевіча. У таго Бялецкага не ведала, колькі будзе сем памножыць на сем, то пакінуў

Злева: Павел Кудэрскі, Ян Война, NN, Яніна Рыбак. Другая палова 1960-х гадоў

Тэатральныя пачаткі ў Орлі

мяне пасля ўрокаў. А тады на апошнім уроку была экскурсія, якая праходзіла каля майго дома, а я мусіла сядзець у школе. Кіраўніком быў Тадэвуш Врублеўскі, вельмі прыстойны чалавек. Калі арыштавалі дзядзьку маёй сяброўкі Тані Адзіевіч, то Врублеўскі паручыўся за яго сваёй працай. А ў той час такое паручэнне было вельмі рызыкоўнае.

Врублеўскага ў 1941 годзе арыштавалі саветы і пасадзілі ў беластоцкую турму, з якой вызвалілі яго беластачане, калі немцы рушылі на СССР. Ягоную жонку, якая паходзіла з Валыні, і двойку дзяцей — Данусю і Веська — вывезлі ў Сібір, адкуль пасля некалькіх гадоў вярнуліся яны ў Польшчу. Сам Врублеўскі (паводле некаторых арлян вярнуўся яшчэ на кароткі час у Орлю) вярнуўся ў сваю родную старонку, у Едлічы каля Горліц, дзе працаваў дырэктарам школы; памёр у 1950-х гадах. Ягоная жонка памерла ў 1970-х гадах; іхнім дзецям зараз будзе за восемдзесят. Восенню 2008 і ў 2010 гадах Весек наведваў Орлю.

Бацькі пасля вяртання з бежанства — былі ў Нікалове Новаінікалаеўскай (цяпер Новасібірск) губерні — пасяліліся ў Орлі, бо Вайштэйну, яўрэйскаму ўладальніку кафлярні, патрэбны быў слесар, а бацька быў у гэтай галіне спецыялістам. Бацькі атрымалі кватэру ў кафлярні, пад ёю акурат выпальвалі кафлю. Бывала, што падлога была настолькі гарачай, што немагчыма было па ёй хадзіць. Пры саветах, калі Лейкін, новы загадчык кафлярні, пабачыў, што мы

Злева: Галіна Пішчатоўская, Лідзія Васілюк, Карнеева, Пётр Грынявіцкі

жывём у такіх умовах, рашыў нам дапамагчы і даў нам кватэру па Абраме Вайштэйне. Наша мама яе нават не хацела, бо гаварыла, што завялікая.

Пасля вайны хацела я вучыцца. Пайшла ў мастацкую школу ў Беластоку, правучылася там год і кінула. Быў там вельмі нізкі ўзровень навучання — прымалі ў тую школу моладзь пасля падставоўкі, а я і яшчэ трое вучняў мелі г.зв. малую матуру. Здала я ўступны экзамен на фармацыю ў Варшаве. Пасля паўгадовай вучобы прыехала я дадому на канікулы і захварэла. Бацькі не дазволілі мне вяртацца ў Варшаву. У сталіцы ў той час былі вельмі цяжкія жыллёвыя ўмовы. Я жыла ў квартале Бродна, па вуліцы 11 Лістапада. Спалі мы ўтрое — я, мая сястра і сяброўка — у адным ложку, у пакоі, дзе зімою вада замярзала ў вёдрах; таму бацькі не дазволілі мне вяртацца туды. Але акурат у той час у Орлі пусцілі ў ход адбудаваную кафлярню, якой дырэктар Петрашкевіч падкупіў мяне прапановай працы, сказаўшы, што буду там працаваць і завочна вучыцца. І так я асталася ў бюро. Вялікі ўклад у пасляваенную адбудову кафлярні ўнёс мой бацька, аддаўшы туды ўсё, што меў у сваёй майстэрні.

У 1950-х гадах у Орлі дзейнічала некалькі культурных суб'ектаў. Па вуліцы Бельскай працаваў Вясковы дом культуры, у рынку быў будынак, у якім атрымала сядзібу кіно „Orzeł", а на тэрыторыі кафлярні была фабрычная святліца — у памяшканні, дзе пры санацыі жыла сям'я ўладальніка завода. І нават дзейнічаў тады тэатр, пра што цяпер мала хто ведае. Акцёрамі былі радавыя рабочыя кафлярні. Заснавалі і вялі той тэатр Анна Фалінская (працавала ў мясцовым геэсаўскім банку) і Людміла Качынская.

Ставілі мы ў тэатры спектаклі, якія былі ў школьных праграмах, м.інш. „Тарцюф" Мальера, „Маладую гвардыю" Фадзеева. Помню, што Тарцюфа іграў Стэфан Рыбак, выступалі таксама Пётр Грынявіцкі, Павел Кудэрскі, Міхал Назарэвіч, Мікалай Шайкоўскі, Ян Война, Ірына Герасімюк. На кожным прадстаўленні была поўная зала публікі. У „Маладой гвардыі" Грыша Савіцкі іграў немца, але ў час рэпетыцый былі з ім клопаты, бо не ўмеў сказаць „Wrzućmy Polaków do pięćdziesięciometrowej studni", ды памянялі яму на „... do stumetrowej studni".

Наш тэатр не займеў сваёй назвы. От, папросту знаходзілі адпаведную п'есу і іграли яе. На сцэне здараліся часам камічныя сітуацыі. Напрыклад, аднойчы гаварыла я нейкую фразу Міхалу Назарэвічу, а той узяў і ... сышоў у той час са сцэны. Праз хвіліну прыпомніў сваю ролю і, на шчасце, вярнуўся. А я мусіла здорава камбінаваць, каб неяк справіцца з сітуацыяй.

У той час людзі ахвотна ўдзельнічалі ў працы нашага тэатра, прыходзілі на рэпетыцыі, слухалі сябе ўзаемна. Выязджалі мы нават у Элк на нейкі фестываль.

Сёння ў Орлі няма „дарослага" тэатральнага калектыву. Затое тэатральныя традыцыі захоўвае школа, дзе ад некалькіх гадоў паспяхова дзейнічае школьны тэатр. Прыемна пахваліцца, што маладыя арлянскія акцёры на адным з цэнтральных конкурсаў беларускіх сцэнічных форм занялі першае месца.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Калісьці ў 2001 годзе, „перамогшы" на чарговых прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі, Аляксандр Лукашэнка назваў тую перамогу „элегантнай". У нечым, магчыма, ён меў рацыю — калі не зважаць на масавыя тагачасныя фальсіфікацыі, перамога над апанентамі, чые агульныя адсоткі падтрымкі склалі каля 20, рэч вартая больш-менш сур'ёзнага асэнсавання. У 2011 годзе асэнсоўваць нейкія адсоткі чарговай лукашэнкаўскай „перамогі" сэнсу няма — нявартыя яны таго, бо абсалютна не адлюстроўваюць палітычных схільнасцей беларускага грамадства. І галоўным доказам тут з'яўляюцца зусім не ўсё тыя ж фальсіфікацыі, а наступствы выбараў для апазіцыйных кандыдатаў і для кола іх патаемных і яўных прыхільнікаў, якое вельмі пашырылася пасля падзей 19 снежня 2010 года ў Мінску. Бо наўрад ці ўладам праз 10-15-дзённыя арышты ўдалося прымусіць каля 600 чалавек, а таксама іх родных і блізкіх, добра ставіцца да лукашэнкаўскага праўлення.

Адным з тых, хто ўжо ўвайшоў у беларускую гісторыю як чалавек, які асмеліўся кінуць выклік лукашэнкаўскай усемагутнасці, а пасля пацярпеў за праўду, стаў паэт і палітык Уладзімір Някляеў. Калі пішацца гэты артыкул, ён збіты знаходзіцца ў турме, у той час як Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз інаўгуруе сябе на наступныя пяць гадоў кіравання над 9,5 мільёна чалавек.

Хоць выбарчая кампанія ў Беларусі ўжо скончылася, у інтэрнэце яшчэ жывуць сайты былых кандыдатаў. Тычыцца гэта ў тым ліку і сайта Уладзіміра Някляева, які змешчаны па адрасе **http://nekliaev.org/be/** і мае вельмі прывабнае выяўленне. На галоўнай яго старонцы месціцца вялікі здымак паэта-палітыка, дзе тлумачыцца, чаго ён пайшоў у прэзідэнты: „Чаму я вырашыў, што буду добрым прэзідэнтам? Таму што быць кепскім не варта. А ўсё астатняе, я думаю, у мяне атрымаецца".

З галоўнай старонкі да іншых рубрык нас вядуць некалькі выйсцяў, будова якіх вельмі адрозніваецца ад традыцыйных. Так, калі мы клікнем на слова „чытаць" пад „Маёй біяграфіяй", то перад намі адкрыецца старонка, якая на першы погляд складаецца з фотаздымкаў і нейкіх гадоў. Але калі навесці „мышкай" на здымак, то адкрываецца тэкст з падзеямі, што адбыліся ў той ці іншы год. Цікава, што ўнізе месціцца своеасаблівая прамая часу з некалькігадовымі адрэзкамі.

Наступнай рубрыкай ідзе „Флаеры і лістоўкі". Яна тычыцца розных агітацыйных матэрыялаў, якія дагэтуль можна спампаваць, а потым раздрукаваць. На гэтай беларускамоўнай нібыта старонцы чамусьці многае пазначаецца па-руску.

Зусім нечаканым з'яўляецца выгляд старонкі „Каманда". Яна цалкам адрозніваецца ад папярэдніх. На карычневым фоне месціцца выява нейкага багата ўбранага пакоя з кніжнымі шафамі, сталом, крэсламі, старадаўнімі свяцільнікамі, прыгожымі фіранкамі. Пералік імён і прозвішчаў людзей, якія ўвайшлі ў каманду Уладзіміра Някляева, змешчаны з правага боку выяўлення. Сярод іх даволі вядомыя ў Беларусі творчыя асобы — Генадзь Бураўкін, Зінаіда Бандарэнка, Юрый Гумянюк і іншыя.

Зразумела, сёння ў лукашэнкаўскіх засценках Някляеў перажывае далёка не лепшыя часы, але ёсць надзея, што выйшаўшы з іх, ён, узмоцнены, працягне сваю як палітычную, так і паэтычную дзейнасць.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Статут Вялікага Княства Літоўскага

У 1988 годзе, будучы ў студэнцкім археалагічным атрадзе, я зайшоў у краму ў Крэве і на паліцы з кніжкамі ўбачыў том сур'ёзнай вагі. Гэта было факсімільнае выданне Статута ВКЛ 1588 года ў цвёрдай вокладцы, выдадзенае адмыслова да 400-х угодкаў з часу, калі ён быў адціснуты ў нашай старажытнай крывіцкай сталіцы. Статут ВКЛ стаўся першым беларускім фаліянтам у маёй бібліятэцы і таму асабістае маё стаўленне да яго досыць сентыментальнае. Не скажу, што яго часта гартаў і ўдумваўся ў змест асобных старонак, рэч тут зусім у іншым. Статут ВКЛ трывала ўвайшоў у свядомасць „васьмідзесятнікаў" разам з прозай Уладзіміра Караткевіча, першымі кніжкамі Кастуся Тарасава і Міколы Ермаловіча. Ён неяк адразу займаў пачэснае месца ў шэрагу культавых знакаў і фактаў нашай гістарычнай мінуўшчыны, цешыў нацыянальны гонар і грэў душу. Гэта ж трэба, наш сярэднявечны збор законаў яшчэ ў шаснаццатым стагоддзі вытрымаў ажно тры выданні (1529, 1566 і 1588 гады), а аналагічны друкаваны звод у суседняй усходняй Масковіі (так званае „Саборнае ўкладанне цара Аляксея Міхайлавіча") з'явіўся на свет толькі ў 1649 годзе! Адзін гэты факт, цвёрды як уласна само лацінскае слова „статут", ламаў „абэцэдарскія" стэрэатыпы, расійскацэнтрычныя міфалагемы і мацаваў беларускую самасвядомасць.

Статут ВКЛ у апошняй рэдакцыі дзеіў на тэрыторыі Беларусі ажно два з паловай стагоддзі — з 1589 і па 1840 год, пакуль не быў забаронены цемрашальскім мікалаеўскім рэжымам. Звод законаў, напісаны на старабеларускай мове, быў надрукаваны летам 1588 года ў славутай віленскай друкарні братоў Мамонічаў. Да слова, друкарня тая была ў тым самым будынку, дзе раней месцілася і друкарня Скарыны. Пазней былі зробленыя пераклады Статута на лацінскую, польскую і рускую мовы. А на золку суверэнітэту Рэспублікі Беларусь статут заставаўся актуальным пры распрацоўцы першай нашай Канстытуцыі, яго палажэнні дэталёва вывучалі юрысты і дапасоўвалі іх да сучаснасці. З сярэднявечнай даўніны і да сённяшніх дзён адукаваныя людзі захапляюцца мудрымі старонкамі гэтай кнігі.

Навукоўцы дагэтуль спрачаюцца, хто больш спрычыніўся да стварэння Статута — Леў Сапега ці Астафей Валовіч. Але не гэта галоўнае. Важна, што абодва яны — сыны беларускай зямлі. Уражвае як людзі ў шаснаццатым стагоддзі ўмелі мысліць катэгорыямі справядлівасці, суадносін дабра і зла, імкнуліся да грамадскай упарадкаванасці і сацыяльнага ладу.

Леў Сапега, на сродкі якога ажыццяўлялася выданне, цвёрда верыў у тое, што краіна тады будзе па-сапраўднаму заможнай і магутнай, калі яе грамадзяне пачнуць жыць па разумных законах. У прадмове ён піша: „Мы такі маем скарб у руках, які за аніякія грошы не купіш. Кожны прыстойны чалавек павінен яго ведаць, каб сам сябе стрымліваў, нікога не крыўдзіў, дзеіў згодна пісанага права. А калі хтосьці яго пакрыўдзіць, дык ведаў, дзе шукаць абарону і лекі ад крыўды...".

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года складаецца з 14 разделаў, куды ўвайшлі 488 артыкулаў. Дакумент забараняў чужынцам займаць важныя пасады, набываць ва ўласнасць на Беларусі маёнткі. Меліся і асобныя артыкулы пра ахову лясоў, лугоў, дзікай жывёлы. Ёсць у Статуце 1588 года і асобны запіс пра нашу беларускую мову, якая тады называлася рускай ці простай: „А пісар земскі павінен па-руску літарамі і словамі рускімі ўсе лісты, выпіскі і позвы пісаць, а не іншай мовай і словамі".

Як усё гэта актуальна і сёння...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Свята, свята… і па свяце

Студзень для вернікаў Праваслаўнай царквы — самы багаты месяц у святочныя дні. Гэта і Ражджаство, і Шчодры вечар, і Вадохрышча. Памятаю даўнейшыя традыцыі, але ад іх адны ўспаміны засталіся. Зараз захавалася адно традыцыя сустракаць Новы год і карнавальныя балі. А як было сёлета ў Чаромсе?

На „сільвестра" (31 снежня) у Гмінным асяродку культуры баль арганізавала „Чарамшына", а перад гмінай адбылася агульнадаступная забава з удзелам войта, радных і гмінных чыноўнікаў. У сваім коле Новы год сустракала кузаўская моладзь у мясцовай святліцы. Былі шампанскае, феерверкі…

На першы дзень Ражджаства па Кузаве хадзілі каляднікі з гвяздамі. На другі дзень калядавалі вясковыя жанчыны. Ішлі вуліцаю і насупраць кожнай хаты спыняліся ды калядавалі. Грошы ад калядавання прызначылі на патрэбы мясцовай царквы.

Праваслаўнага „сільвестра" чарамшане адзначалі пры застоллі ў сямейным крузе. Я, напрыклад, правёў вечар з радыёпрыёмнікам, слухаючы канцэрт пажаданняў на Радыё „Рацыя". Новы год (праваслаўны) я адзначаў у Гмінным асяродку культуры на штогадовай забаве, арганізаванай Саюзам польскіх пенсіянераў і інвалідаў. Сёлета зацікаўленне мерапрыемствам было невялікае, хоць абвесткі аб ім былі распаўсюджаны ў наваколлі намнога раней. Старшыня арганізацыі Юзаф Дубковіч сказаў, што першапачаткова ахвоту ўдзельнічаць у навагодняй забаве заявіла больш за сотню пенсіянераў, але прысутнічала менш за палову. А шкада, бо беларускі музычны гурт з Тапаркоў іграў цудоўна і атмасфера была сапраўды свойская, сяброўская. У перапынках паміж танцамі выконваліся песні. Запяваламі былі госці з Баброўкі, а дапамагалі ім мясцовыя жанчыны. Раіса Баярунец, напрыклад, выступіла перад публікай з песняй „Смуглянка". Прысутныя ўзнагародзілі яе бурнымі апладысментамі. У імпрэзе ўдзельнічаў войт Ежы Шыкула і старшыня Рады гміны Надзея Суліма. У кароткім выступленні кіраўнік самаўрада павіншаваў прысутных з наступаючым Новым годам ды падзякаваў ім за падтрымку яго кандыдатуры на самаўрадавых выбарах. Заклікаў таксама да належнага супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва з гмінай. „Нічога пра вас без вас!" — сказаў на канец.

Сардэчна дзякую арганізатарам за цудоўны вечар, а пенсіянерам у 2011 годзе жадаю моцнага здароўя, шмат цёплых і сонечных дзён у сямейным жыцці ды здзяйснення мараў.

Пры сямейным застоллі запявалы з Баброўкі

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

Дэмаграфія Нараўчанскай гміны

Трыццаць гадоў назад у Нараўчанскай гміне пражывала 6 570 чалавек (3 335 мужчын і 3 235 жанчын), а пятнаццаць гадоў таму гміна налічвала 5 330 асоб, у тым ліку 2 705 мужчын і 2 625 жанчын.

У 1980 годзе ў Нараўцы пражывала 857 чалавек, у Семяноўцы — 809 і ў Скупаве — 460.

Цяпер Нараўчанская гміна налічвае 4 052 жыхары. Зараз у Нараўцы пражывае 934 жыхары, у Семяноўцы — 427, у Старым Ляўкове — 367, у Новым Ляўкове — 228, у Скупаве — 208, у Міклашэве — 182 і ў Плянце — 163.

Ад 100 да 150 жыхароў налічваюць вёскі: Лешукі — 146, Альхоўка — 120, Тарнопаль — 117 і Ахрымы — 108.

Ад 50 да 100 жыхароў пражывае ў вёсках Свінароі — 94, у Міхнаўцы і Старым Масеве — па 67 ды ў Гушчэвіне — 61.

На працягу апошніх дзесяці гадоў найбольш абязлюджанымі сталі вёскі: Семяноўка (тут паменшала ажно на 147 чалавек), Старое Ляўкова (73), Скупава (51), Нараўка (47), Міклашэва (42) і Новае Ляўкова (31).

Памірае больш жыхароў, чым нараджаецца. У 2009 годзе нарадзілася 27 дзяцей, а памерлі 64 асобы.

Аднаўленне вуліц — прыярытэтам

У мінулым годзе асфальтавыя маставыя пабудавалі ў Гайнаўцы на вуліцах Багенная і на адрэзку вуліцы Тарговай. Яны спалучаныя. Абедзве знаходзяцца на паўднёва-заходнім рубяжы горада. Новых маставых дачакаліся таксама вуліцы Тапалёвая, Спіральная і Ютшэнкі — яны знаходзяцца ў паўночна-заходняй частцы горада.

Шмат вуліц у Гайнаўцы яшчэ чакае лепшай маставой, але немагчыма ўсё адразу. Бюджэт горада абмежаваны. Ён дазваляе амаль кожны год асфальтаваць па некалькі вуліц.

На 2011 год запланавалі перабудову вуліц Спакойнай, Далёкай, Сасновай, Лясной і Мілкоўскага ды вуліцы Старая Юдзянка.

Па гарачых слядах

Зараз у Нараўцы (Гайнаўскі павет) нялёгка знайсці вуліцу Вузкую. Надпіс „Wąska" зусім выблек. І хутчэй можна здагадацца, што тут калісьці было напісана, чым прачытаць. Гэтая вуліца адыходзіць ад адной з галоўных нараўчанскіх вуліц — ад вул. Міцкевіча.

Ёсць вуліца Агародная (яна адыходзіць ад вуліцы Гайнаўскай). Надпіс „ul. Ogrodowa" на вугле дома закрылі вялікай дошкай з надпісам „Art. Spożywcze" і не ўсе літары можна прачытаць. Можна дадумацца, што гэтую другую дошку на вугле будынка прыбіў уласнік прадуктовай крамы з вул. Гайнаўскай. Якая самаволя! Ці акурат тут было на гэта адзінае месца? Цікава, што гэтага дагэтуль ніхто не прыкмеціў? Мне вядома, што па вул. Агароднай жыве працаўніца Гміннай установы ў Нараўцы.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Адгаданка

1. праследнік, прыгнятальнік, 2. ручная рычажная вага, 3. горад на захадзе Германіі пры бельгійска-нідэрландскай граніцы, 4. горад пры ўпадзенні Аршыцы ў Дняпро, 5. часціна матэрыі з ядром і электронамі, 6. Мар'ян, паэт з Мядзельскага раёна, 7. школьная адзінка часу, 8. драўляная пасудзіна для заквашвання цеста, 9. паездка па далёкіх мясцовасцях.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афрыканская пагаворка.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 52 нумара

Азон, аметыст, апёк, Бенін, ваза, веер, вона, Друя, Ева, жоўць, мара, мель, місія, невук, Ніневія, нож, пава, паж, пена, сіняк, сын, Сыс, тона, трэць, хват, храм, цана, цюль, Цюмень, чай, язь.

Рашэнне: **Мароз, паважны як вяльможа, знасіць свавольніцтва не можа і на той час, як ён пануе, па небе хмарка не вандруе, і ўсе стварэнні занямеюць, і патыхаць вятры не смеюць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Раману Свірыдзюку** з Рыбал.

30.01 — 05.02

(22.03. — 20.04.) Рэалізуй свае самыя запаветныя мары і задумы. Аграмадны прыліў энергіі, ды не сказана, што штосьці будзеш будаваць — аднолькава можаш выкарыстаць яе на… руйнаванне! Ды будзеш яшчэ свята перакананы, што дзейнічаеш у слушнай справе. Пастарайся пазбыцца шораў на вачах.

(21.04. — 21.05.) У апошнія дні студзеня хтосьці можа параніць твае пачуцці. У лютым будзеш працаваць на ўсю катушку, змагацца за сваю пазіцыю ў фірме або пазіцыю тваёй фірмы на рынку. Лёгка не будзе, ды поспех і задавальненне будуць агромныя!

(22.05. — 22.06.) Не раскідвайся грашыма. У перасвараных парах запануе згода, у гэтых, што сабою знудзіліся — ажыўленне. Там, дзе было холадна — ацяпленне. А калі тваё сэрца яшчэ самотны паляўнічы — адстрэліш немалую штуку!

(23.06. — 23.07.) У апошнія дні студзеня не плануй падарожжа. У лютым тое, што ты пасеяў, пусціць парасткі. Нясмелыя прыбыткі і поспехі. Цешся імі і чакай большага! І сэрца таксама пачне біць мацней; мабыць, гэта пачатак вялікага кахання ці незабыўнага рамана.

(24.07. — 23.08.) Каханне здамінуе ўсе справы. Шмат Ільвоў знойдзе цяпер сваю палавінку. Не будзеш чакаць Валянцінак — свае пачуцці выкажаш адразу, без прыступаў, не ўяўляючы магчымасці, што табе адмовяць. Бо і няма такой магчымасці.

(24.08. — 23.09.) Не адмаўляй сабе прыемнасці — еж, танцуй і кахай, а будзеш шчаслівы. Адкрыеш, як цудоўна ісці за голасам сэрца. Прачнуцца ў табе вялікія амбіцыі. Будзеш зацікаўлены дзеяннямі толькі ў маштабе макра. Можаш патрабаваць павышэння ці большай зарплаты; калі падрыхтуеш саліднае абгрунтаванне — можа ўдацца!

(24.09. — 23.10.) У студзені будзь вельмі асцярожным, асабліва пры чужых. Будзеш аздобай балаў і зоркай мерапрыемстваў. Збярэш вакол сябе вялікае кола прыхільнікаў і аматараў. Зломіш не адно сэрца; можа камусьці ўдасца здабыць тваё.

(24.10. — 22.11.) Сёлета ты вязучы, ды найбольш дасягнеш уласнай працай. Будзеш лагаднейшы, пакажаш свету сваё больш чалавечнае аблічча. Кагосьці падтрымаеш у патрэбе, кімсьці заапякуешся, паможаш ва ўроках або пагаворыш з настаўнікам ці дырэктарам у чыёйсьці справе. У каханні шчасце да цябе ўсміхнецца.

(23.11. — 22.12.) У апошнія дні студзеня адпачывай, бо ў лютым не будзеш мець хвіліны перадышкі. Шмат руху, бегатні, афармляння спраў у апошнюю хвіліну. Павялічыцца твая самаўпэўненасць. Можаш пачаць акліматызавацца ў новым асяроддзі і мець першыя поспехі.

(23.12. — 20.01.) Добрая арыентацыя ў сітуацыі гарантуе табе поспех. На працы выйдзеш з ценю і пакажаш, што зможаш. Можа трапіцца табе каханне зусім не там, дзе спадзяешся — хопіць адзін пагляд, і будзеш ведаць! Пойдзеш як на шнурочку! У пастаянных парах спробы сіл; схочацца паказаць хто тут мае ўладу, і кропка!

(21.01. — 19.02.) Зловіш вецер у ветразі і выплывеш на шырокія воды. Гарантуюцца табе незабыўныя ўражанні; выклічаш сімпатыю атачэння. Будзеш аздобай не адной забавы. Зоркі адораць цябе харызмай і ідэямі. Будзь у спакоі, а прыцягнеш шчасце, грошы і любоў.

(20.02. — 21.03.) У апошнія дні студзеня можаш адчуць сум і сумненні; не падавайся абы-чаму. Канец з няўпэўненасцю і турботамі! Адчуеш, што ўсё ідзе ў патрэбным напрамку. Мусіш толькі аддзяліць мроі ад планаў, у якіх ёсць рукі і ногі. Запалу хопіць, работа будзе гарэць у руках. Будзеш адважны, баявіты, з'яднаеш прыхільнікаў і нават можаш пакіраваць калектывам. Інтуіцыя не падвядзе, а нават паможа табе нямала зарабіць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

*Уладзімір Няфёд у сваёй кнізе „**Ігнат Буйніцкі — бацька беларускага тэатра**" (Мінск 1991, с. 88) пісаў: „Поспех **Ігната Буйніцкага** ў Варшаве яшчэ раз наглядна сведчыць як аб высокім узроўні яго мастацтва, так і аб вялікім значэнні, якое яно мела ў нацыянальным адраджэнні беларусаў".*

Выступленне ІГНАТА БУЙНІЦКАГА ў Варшаве

1913 год. Студэнты-беларусы Варшаўскага ўніверсітэта запрасілі да сябе ў госці Першую беларускую трупу Ігната Буйніцкага. Сам Ігнат Буйніцкі і яго калектыў ужо быў вядомы на Беларусі. Рэпертуар гэтага нацыянальнага прафесійнага беларускага тэатра складаўся з песень, танцаў і пастановак п'ес. Ён у першую чаргу меў разлік на масавага беларускага гледача і ўлічваў іх інтарэсы і патрабаванні. Але царскія ўлады непрыхільна ставіліся да паказу са сцэны твораў на беларускай мове, асабліва на вострыя сацыяльныя тэмы, яны нярэдка забаранялі выступленні. Тым не менш калектыў Ігната Буйніцкага з вялікім поспехам выступаў у Дзісне, Паставах, Полацку, Слуцку, Нясвіжы, Клецку, Ляхавічах, Свянцянах, Мінску і ў іншых гарадах і мястэчках. Тройчы ён быў у Пецярбургу, дзе паказваў сваё майстэрства перад беларускай моладдзю.

Ігнат Буйніцкі з дачкой у час танца, 1910 год

Напачатку XX стагоддзя пра паспяховыя выступленні трупы Ігната Буйніцкага добра ведалі і беларусы Варшавы. Праз рэктара Варшаўскага ўніверсітэта Яўхіма Карскага яны загадзя, за некалькі гадоў, дамовіліся, што зімой 1913 года беларусаў Варшавы пацешыць першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага. Яўхім Карскі тады ўжо не займаў пасады рэктара ўніверсітэта, але арганізаваць сустрэчу дапамагаў. Асабліва рупілася яго жонка Соф'я Мікалаеўна Карская. Дарэчы, родам яна была з-пад Саколкі. Спадарыня Карская разам з беларускімі жанчынамі Варшавы актыўна займалася прыгатаваннем беларускіх страў і пачастункаў, а таксама афармленнем залы, дзе павінен быў выступаць калектыў Ігната Буйніцкага.

Але працэс падрыхтоўкі гастроляў нашага вялікага заснавальніка тэатра ў Варшаву быў няпросты. Хоць большая частка студэнтаў шчыра хацела правесці выступленні беларускіх артыстаў на вышэйшым узроўні, былі ж і такія, хто не вельмі цікавіўся і жадаў, каб развівалася беларуская культура, нацыянальнае адраджэнне беларусаў. Гэтыя супярэчнасці паміж рознымі студэнтамі і выкладчыкамі прывялі да таго, што ўскладнілася справа з друкаваннем тых самых афіш аб вечарыне і гастролях Ігната Буйніцкага, а таксама з іх распаўсюджваннем.

20 лютага 1913 года газета „Наша ніва" паведамляла, што «афішаў на беларускай мове мы не бачылі на вечарынцы, хоць яны і былі надрукаваныя. „Беларускі каляндар" і „Крапіва" прадаваліся, але другія кніжкі ляжалі ў куточку прыкрытыя. Меліся на гэты вечар выдрукаваць аднаднёўку на беларускай мове, а выдалі па-расейску і толькі на канцы памясцілі крыху беларускіх жартаў».

Ігнат Буйніцкі ў Варшаву прыехаў са сваёй старэйшай дачкой — даволі таленавітай спявачкай і танцоркай. Яны прывезлі з сабой скрыпача, старэчу-дудара, цымбаліста і іншых музыкаў і танцораў. У вялікім багажы Буйніцкіх аказалася шмат беларускіх нацыянальных касцюмаў для артыстаў, ручнікоў і дываноў для дэкарацый.

У першыя дні прыезду ў Варшаву Ігнат Буйніцкі не сядзеў без спраў. Ён таксама рыхтаваўся да выступлення. З асяроддзя беларускіх студэнтаў і выкладчыкаў майстра сцэнічнага мастацтва згуртаваў хор і танцавальны калектыў. Штодзень праводзіў з імі рэпетыцыі, гутарыў, адказваў на пытанні і пытаўся ў студэнтаў, як ім вучыцца і жывецца ў Варшаве.

Вечарына адбылася 15 лютага ў зале „Швейцарская даліна". Зала была падчас выступлення далёка не швейцарскай, а беларускай. Яе афармілі з беларускім густам. Там былі хаткі са студнямі, снапкі, кветкі, ручнікі і паясы. Арганізавалі таксама беларускую кухню, сябры якой частавалі прысутных беларускімі стравамі, такімі як верашчака з грэчневымі блінамі, каўбасамі, калдунамі, квасам і г.д. Студэнты і проста люд стравы расхапілі імгненна.

Мастацкая частка вечара была надзвычай удалай і багатай. Шматлікі хор выканаў лепшыя беларускія песні. А танцы былі пастаўлены вышэй усякай пахвалы. Некаторыя нумары праграмы выконваў сам Ігнат Буйніцкі. Дэкламатары чыталі лепшыя вершы беларускіх паэтаў. Са сваімі творамі выступаў і паэт Гальяш Леўчык, які тады жыў і працаваў у Варшаве. Больш падрабязна пра гэта напісала „Наша ніва" 20 лютага 1913 года: «На сцэне мы бачылі і чулі беларушчыну. Хор са студэнтаў і курсістак нязгорш прапяяў беларускія песні „А хто там ідзе?", „Дуду-весялуху", „Чаму ж мне не пець" пад загадам студэнта М. Тэадаровіча, катораму належыць падзяка за рупнасць і працу; за такі кароткі час навучыць хор трэба было натугі. Малады спасобны хлопец, вучанік штукарскай школы ў Варшаве, Павел Гуткоўскі з пачуццём дэкламаваў „Абразкі" Пётры Простага, шкода толькі, што трохі заціха, не ўсе чулі, але на „біс" ужо казаў галасней творы А. Паўловіча і „Важную хвігу" Ядвігіна Ш. Найбольш падабаліся публіцы нашы народныя танцы пад загадам штукара-танцора Ігната Буйніцкага. Яго трупа на шэсць пар танцораў пад музыку сялян, што з ім разам прыехалі: дудара, скрыпача і цымбаліста, проста зрабіла на публіку захват і дзіва, бо хто ж калі там бачыў народныя беларускія танцы „Лявоніха", „Мельнік", „Верабей", „Юрка", „Мяцеліца". Відаць было з гэтага ігрышча, што беларус, ці ён праваслаўны, ці католік, адчувае глыбока ўсё сваё роднае. Відаць гэта было і з таго, як прашчаліся студэнты з Буйніцкім на вакзале, і з той прамовы, якую сказаў адзін студэнт пры прашчанні. Шчырая падзяка належыць студэнту Грыгору Гуткоўскаму, бо каб не ён, то саўсім не было б нават надрукаванай праграмы па-беларуску».

Аўтар гэтай інфармацыі крыху памыліўся. Бо тады ў Варшаве вучыліся два браты Гуткоўскія — Павел і Мікалай. Былі яны родам са Случчыны. Павел вучыўся ў Варшаўскай мастацкай школе, а Мікалай Гуткоўскі — на юрыдычным факультэце Варшаўскага ўніверсітэта. Магчыма, гэта быў не Рыгор Гуткоўскі, а Павел Гуткоўскі. Бо Мікалай Гуткоўскі ў 1913 годзе, калі прыязджаў Ігнат Буйніцкі ў Варшаву, працаваў ужо служачым, а Варшаўскі ўніверсітэт ён скончыў на год раней. Праўда, на канцэрце Буйніцкага ён таксама прысутнічаў. Пазней браты Гуткоўскія былі рэпрасаваны. Мікалая расстралялі ў 1938 годзе, а Павел, адбыўшы тэрмін, вярнуўся на Бацькаўшчыну, дзе памёр у 1962 годзе.

Вечарына Ігната Буйніцкага ў Варшаве мела непаўторны поспех. З асаблівым зацікаўленнем і шчыра выступленні беларускіх артыстаў прыняла і польская публіка Варшавы. На другі дзень амаль усе польскія газеты Варшавы надрукавалі на сваіх старонках пахвальныя і станоўчыя рэцэнзіі, у якіх падкрэслівалася выдатнае мастацкае і грамадскае значэнне вечарыны.

Уладзімір Няфёд у сваёй кнізе „Ігнат Буйніцкі — бацька беларускага тэатра" (Мінск 1991, с. 88) пісаў: „Поспех Ігната Буйніцкага ў Варшаве яшчэ раз наглядна сведчыць як аб высокім узроўні яго мастацтва, так і аб вялікім значэнні, якое яно мела ў нацыянальным адраджэнні беларусаў".

Сяргей ЧЫГРЫН



ШТО ВЫ, ПРАФЕСАРЫ, РОБІЦЕ?

Сустрэча з прафесарам Уладзімірам Снапкоўскім на Кафедры беларускай культуры яшчэ напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў (9 снежня 2010 г.) пакінула прыгнятальны настрой бездапаможнасці. Прафесар асвятліў асновы замежнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Цягам апошняга стагоддзя гэтае пытанне рэдка калі асвятлялася кіраўніцтвам краіны. Яшчэ да 1991 года насельніцтва рэспублікі і палітыкі ўсведамлялі сябе жыхарамі маленькай, пазбаўленай прыродных багаццяў краіны. Беларусы — як адзначыў дакладчык — баяліся слова „незалежнасць". Сёння могуць шакіраваць пастановы Беларускага народнага фронту ад 1989 года, які дамагаўся „поўнай рэалізацыі правоў запісаных у канстытуцыі БССР", а справа датычыла больш поўнага ўдзелу ў АБСЕ. У 1991 годзе парламент узняў размову аб прынцыпах палітычнай дзейнасці ў адносінах да асноўных пытанняў, як павага суверэнітэту, прызнанне дэкларацыі правоў чалавека, стварэнне ўмоў для рынкавай эканомікі.

Пасля прыходу да ўлады Аляксандра Лукашэнкі пытанне замежнай палітыкі пачаў вырашаць адзін чалавек, які абмежаваў справу да належных сабе мерак. Сёння ўсё залежыць ад настрою і рашэння дыктатара. Ізаляванасць Беларусі ў Еўропе абыякавая кіраўніку дзяржавы. На закіды, што падтрымоўвае сувязі з экзатычнымі краінамі, такімі як Венесуэла ці Кітай, Лукашэнка мае адзін адказ: *Ідзем туды, дзе нас прымаюць!*

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў шмат гаварылася аб прапановах Еўропы. За правядзенне дэмакратычных выбараў Еўрасаюз паабяцаўся ўспамагчы Беларусь трыма мільярдамі еўра. План, як паказала жыццё, не спрацаваў. 9 снежня прафесар Снапкоўскі не адважыўся прадказаць перспектывы замежнай палітыкі сённяшняга беларускага ўрада. На пытанне, што можа памяняцца ў замежнай палітыцы ў выніку пройгрышу Аляксандра Лукашэнкі, прафесар адказаў: *Усё.*

Аднак сам дакладчык, як і аўдыторыя беларускіх чацвяргоў, якая шматлюдна прыйшла на сустрэчу, не разважалі такога варыянта.

Шмат спадзяванняў ускладзена на місію ўніверсітэтаў у фармаванні будучыні краіны. Такое пытанне ад гадоў гучыць у Рэспубліцы Беларусь. Прафесар Снапкоўскі крытычна ставіцца да навуковых установаў і ў прыватнасці да самога сябе. У час сустрэчы з незалежнымі кандыдатамі ў прэзідэнты ў 2006 годзе яго калег публічна спыталі: *Што вы, прафесары, робіце?*

У адказ пачуўся адзін, шчыры да болю, адказ: *Маўчым.*

— У нас няма салідарнасці сярод навуковых сіл, — кажа дакладчык, — кожны баіцца за сябе. Людзі ведаюць, што калі цяпер цябе не кранулі, то магчыма гэта зробяць у будучыні. Пра нас усё ведаюць, мы пад пільным наглядам. Калі пра студэнтаў? Яны паводзяць сябе інакш як у іншых краінах. Нашы студэнты не дазваляюць сабе на шчырасць. Яны разумеюць, што гэта нясе пэўную небяспеку.

* * *

У дзень прэзідэнцкіх выбараў, 19 снежня 2010 г., на вуліцы Мінска выйшла сорак тысяч людзей, каб запратэставаць супраць фальсіфікацыі выбараў. Сярод пратэстуючых асноўную масу складалі студэнты і моладзь. Плошча, згодна з традыцыямі дыктатуры, была спецыфікавана, але дазволіла больш аптымістычна глянуць на будучыню замежнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. **(гак)**

ISSN 0546-1960